ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

18 КРАСАВІКА 2013 г. ЧАЦВЕР № 72 (27437) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Часопісу «Маладосць» — 60! Як заставацца маладым, як вытрымліваць канкурэнцыю і чаму жанчын у літаратуры становіцца больш — пра гэта разважае яго галоўны рэдактар Святлана Дзянісава.**



**Зборная КВЗ БДУ была на слыху на мяжы 2000-х гадоў. Усё ж такі дзве перамогі ў Вышэйшай лізе! Але потым была «белая пляма». У 2010 годзе каманда аднавілася дзякуючы маладым і харызматычным гульцам.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ГАЕЎСКІ, дзяржаўны санітарны ўрач:**

***«У тым, што вакцынацыя патрэбна, няма ўжо ніякіх сумневаў. За апошнія 50 гадоў у Беларусі папярэджана больш за 3 млн выпадкаў адзёру, захваральнасць на краснуху за 13 гадоў знізілася ў 4 тысячы разоў, дыфтэрыю — у 14 тысяч, у 10 разоў — на вірусны гепатыт В; дзякуючы эфектыўным праграмам вакцынацыі дзіцячага насельніцтва ў краіне зусім знік поліяміэліт, захворванне на адзёр не рэгіструецца або адзначаюцца адзінкавыя завазныя выпадкі (у дапрышчэпачны перыяд рэгістравалася каля 70 тыс. выпадкаў за год). Аднак праблемы з вакцынацыяй у свеце не ўсюды вырашаюцца аднолькава. А міграцыйныя працэсы цяпер вельмі актыўныя, варта толькі дзесьці камусьці аслабіць працу — пачынаюцца праблемы».***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 10° |
| Віцебск | + 21° |
| Гомель | + 20° |
| Гродна | + 20° |
| Магілёў | + 19° |
| Мінск | + 20° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.04.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8630,00 | ▼ |
| Еўра | 11370,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 276,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1060,20 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# САЛОДКІЯ СЛЁЗЫ ВЯСНЫ

**У Малагарадзячыцкім лясніцтве Любанскага лясгаса ідзе нарыхтоўка бярозавага соку. Дзве брыгады леснікоў за чатыры дні нарыхтавалі ўжо 30 тон гэтага вясновага прадукту.**

**— Гэтая справа ў нас ляжыць на плячах саміх работнікаў лесу. Тым больш што леснікі ведаюць, як правільна весці нарыхтоўку, каб не нашкодзіць дрэвам,— сказаў ляснічы Сяргей Сулім.**

**Другі год у адной з гэтых брыгад разам працуюць бацька з сынам Міхаіл і Вадзім Сліўцы (на фотаздымку на першым плане), вопытны ляснік Мікалай Хоміч.**

**Свежы бярозавы сок лясніцтва здае кампаніі «Савушкин продукт» і вельмі задаволена гэтым супрацоўніцтвам. За час нарыхтоўкі малагарадзячынцы плануюць адправіць у Брэст 95 тон бярозавіку.**

## КУЗНЯ ЧЭМПІЁНАЎ

***Рэспубліканскаму дзяржаўна-грамадскаму аб'яднанню «Беларускае фізкультурна-спартыўнае таварыства «Дынама»***

**Паважаныя таварышы!**

Віншую вас з 90-годдзем стварэння таварыства «Дынама» — найстарэйшай фізкультурна-спартыўнай арганізацыі Беларусі.

Застаючыся на працягу дзесяцігоддзяў кузняй чэмпіёнаў, БФСТ «Дынама» адыгрывае вядучую ролю ў спорце найвышэйшых дасягненняў, выхаванні алімпійскага рэзерву, развіцці гульнявых дысцыплін.

Прыемна, што на трох апошніх Алімпійскіх гульнях дынамаўцы заваявалі 26 медалёў і неаднаразова дабіваліся перамог у міжнародных спаборніцтвах.

Здароўе нацыі — адзін з найважнейшых прыярытэтаў нашай дзяржаўнай палітыкі. Важна, што сёння ў БФСТ «Дынама» захоўваюць і прымнажаюць свае лепшыя традыцыі, прапагандуюць здаровы лад жыцця, садзейнічаюць патрыятычнаму і маральнаму выхаванню моладзі.

Упэўнены, што, абапіраючыся на магутны патэнцыял і маючы перспектыўнае бачанне задач, таварыства «Дынама» ўпішa яшчэ нямала яркіх старонак у слаўны летапіс айчыннага спорту.

Жадаю ўсім дынамаўцам здароўя, поспехаў, дабрабыту і новых перамог у імя працвітання Беларусі.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

■ Надзённае

# У ДЗІЦЯЧЫ САД — ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

**Электронная чарга ў дзіцячыя сады будзе запушчана ў бліжэйшы час у Гомелі і ў адным з раёнаў сталіцы. Інтэрнэт-праграма дазволіць бацькам стаць на ўлік, не выходзячы з дому. Для гэтага дастаткова будзе проста зарэгістравацца на сайце і атрымаць пацвярджэнне ад аддзела ці ўпраўлення адукацыі.**

Хутчэй за ўсё, для апрабацыі электроннай чаргі ў Мінску будзе абраны Заводскі раён, дзе з прадастаўленнем месцаў у дашкольных установах асаблівых праблем не ўзнікае. Напэўна, жыхарам мікараёнаў новабудоўляў у гэта цяжка паверыць, але агульная колькасць месцаў у сталічных дзіцячых садках дазваляе задаволіць патрэбы маленькіх мінчан.

Як расказала **начальнік упраўлення дашкольнай адукацыі Міністэрства адукацыі Галіна МАКАРАНКАВА,** усяго ў краіне функцыянуюць зараз 4 070 устаноў дашкольнай адукацыі з праектнай магутнасцю 453 065 месцаў. А колькасць дзяцей, што іх наведваюць, складае 412 866 чалавек. Вядзецца будаўніцтва яшчэ 17 дзіцячых садкоў — кожны новы садок абыходзіцца дзяржаве ў суму не менш як 40 мільярдаў рублёў. У гарадах установы дашкольнай адукацыі наведваюць 94,6% дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў, а ў сельскай мясцовасці — 73,4%.

Летась утрыманне аднаго выхаванца ў дзіцячым садку каштавала дзяржаве прыкладна 15 мільёнаў рублёў (гэта без уліку бацькоўскай платы). Як вядома, з 1 сакавіка памер бацькоўскай платы вырас у 1,5 раза. Калі да апошняга часу бацькі аплачвалі толькі 40% ад кошту харчавання дзяцей у дзіцячых садках, то цяпер яны пакрываюць 60% ад дзейных грашовых нормаў выдаткаў на харчаванне аднаго выхаванца.

СТАР. 3

■ Вялікая вада

# ПАВОДКА: чакаем другі этап

**На большасці рэк краіны ўжо пачалася актыўная фаза развіцця вясновага разліву рэк, інтэнсіўнасць росту ўзроўню вады будзе паявлічвацца, але сітуацыю нельга назваць небяспечнай.**

— Паводка ў нашай краіне, асабліва ў палескім рэгіёне, лічыцца звычайнай перыядычнай з'явай. На працягу апошніх 20 гадоў самыя буйныя з іх у Беларусі назіраліся ў 1999, 2004 і 2010 гадах. Тады затопленымі аказаліся сотні населеных пунктаў і вялікія плошчы сельскагаспадарчых земляў, — паведаміў першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення дзяржаўнай сістэмы папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый і грамадзянскай абароны Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі Алег Сівец.

Праблема паводак, нягледзячы на будаўніцтва дамбаў і розныя іншыя тэхнічныя хітрыкі, на думку супрацоўнікаў МНС, у Беларусі не знікне ніколі. Перш за ўсё таму, што некаторыя жыхары падтопленых паводкай раёнаў выступаюць супраць дамбаў і лічаць так: чым больш шая вада вясной, тым большага ўраджаю варта чакаць у выніку.

Тым не менш будаўніцтва дамбаў — адзін з самых выніковых метадаў папярэджання паводак. Пачынаючы з 1999 года, на Палессі пабудавана больш за 460 кіламетраў дамбаў, 51 помпавая станцыя, 340 кіламетраў вадазборных каналаў і вадапрыёмнікаў. Для ўласнікаў прыватных дамоў лепшы спосаб прафілактыкі падтаплення талымі водамі — ачысціць ад снегу, лёду і гразі водаадводныя каналы альбо пракапаць іх. Там, дзе неабходна, праводзяцца выбуховыя работы для ліквідацыі лядовых затораў.

СТАР. 2

## ПАДЗЯКА ПРЭЗІДЭНТА ЗА ПЛЁННУЮ ПРАЦУ

**Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, значны ўклад у будаўніцтва Мінскага метрапалітэна і ў сувязі з 35-годдзем пачатку будаўніцтва метро ў Мінску аб'яўлена калектыву работнікаў будаўнічага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскметрабуд». Адпаведнае распараджэнне падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Падзяка Прэзідэнта таксама аб'яўлена калектыву работнікаў ААТ "Гроднапрамбуд" за правядзенне ў кароткія тэрміны і на высокім узроўні рамонтна-аднаўленчых работ у сярэдняй школе № 2 горада Крымска Краснадарскага края Расійскай Федэрацыі.

За шматгадовую плённую працу ў будаўнічай галіне, значны асабісты ўклад у развіццё мостабудавання падзякі Прэзідэнта ўдастоена начальнік будаўнічай лабараторыі ААТ «Мостатрад № 425» з Віцебска Галіна Валынец.

Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена намесніку старшыні Брэсцкага аблвыканкама Якаву Бухавецкаму за шматгадовую плённую працу і значны асабісты ўклад у развіццё аграпрамысловага комплексу.

Старшыня грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Мікалай Чаргінец удастоены падзякі Прэзідэнта за значны асабісты ўклад у сацыяльна-культурнае, грамадска-палітычнае жыццё краіны, развіццё і прапаганду айчыннай культуры і літаратуры.

Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена дырэктару Магілёўскага дзяржаўнага абласнога ліцэя № 3 Канстанціну Грыгаровічу за шматгадовую плённую працу ў сістэме адукацыі, значныя дасягненні ў прафесійнай дзейнасці.

Медыцынская сястра Дзіцячага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця Ала Шымановіч удастоена падзякі Прэзідэнта за шматгадовую плённую працу, высокае прафесійнае майстэрства, значны асабісты ўклад у арганізацыю медыцынскага абслугоўвання дзяцей-інвалідаў.

За шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, значны асабісты ўклад у рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў сферы сацыяльнай абароны насельніцтва падзяка Прэзідэнта аб'яўлена начальніку аддзела сацыяльнага страхавання Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Ларысе Капыльскай і начальніку ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Жыткавіцкага райвыканкама Наталлі Макарэвіч.

■ Парламенцкі дзённік

# СПЯШАЦЦА ПАВОЛЬНА

**На другім пасяджэнні вясновай сесіі Палаты прадстаўнікоў дэпутаты актыўна законапраекты абмяркоўвалі, спрачаліся з міністрамі, якія іх прадстаўлялі, і... прымалі, узяўшы з распрацоўшчыкаў абяцанне дапрацаваць іх да другога чытання.**

### Спорт: новы закон як прыступка да кодэкса

Першым такім дакументам стаў праект Закона «Аб фізічнай культуры і спорце». Зноў было паднята пытанне пра мэтазгоднасць прыняцця новага закона на фоне прызнанай і спартыўнай суполкай, і кіраўніком дзяржавы неабходнасці распрацоўкі адпаведнага кодэкса. У адказ і спікер верхняй палаты парламента Уладзімір Андрэйчанка, і міністр спорту і турызму Аляксандр Шамко, і намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы Вадзім Дзевятоўскі падкрэслілі, што пытанне абмяркоўвалася на спецыяльнай, досыць прадстаўнічай, парламенцкай камісіі, дзе аднагалосна было вырашана, што спачатку новы закон, а потым — кодэкс.

— Спяшацца з падрыхтоўкай кодэкса не варта, — пераконваў калег-дэпутатаў **Вадзім Дзевятоўскі.** — Гэта сур'ёзная работа. Нельга не ўлічваць і тое, што зараз адбываецца рэарганізацыя спартыўнай галіны. Аптымальна ў гэтай сітуацыі прыняць закон як аснову для будучага кодэкса і паглядзець, як ён будзе працаваць.

Аднак і самім законапраектам не ўсе дэпутаты былі задаволены. **Мікалай Самасейка, старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах,** прапанаваў замацаваць у законе напрацаваную практыку трансферу спартсменаў і ўвесці хаця б мінімальную адсылачную норму адносна міжнароднага пераходу спартсменаў.

**Мікалай Іванчанка, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы,** выказаўся за ўключэнне ў законапраект пытанняў фінансавання і самафінансавання ў спорце. Ён заўважыў таксама, што дакумент не ўлічвае вопыт міжнароднага супрацоўніцтва, і прапанаваў дапрацаваць антыдопінгавыя артыкулы.

Вадзіма Дзевятоўскага здзівіла, што толькі пры вынясенні законапраекта на першае чытанне дэпутатамі з іншых камісій былі агучаны ўсе гэтыя прапановы і пытанні. Ён заклікаў парламентарыяў, а таксама ўсіх, каму цікавая сфера фізічнай культуры і спорту, быць такімі ж актыўнымі падчас работы працоўнай групы над законапраектам, «калі ёсць час», запэўніўшы, што ў гэтым зацікаўлена і кіраўніцтва спартыўнай галіны краіны.

### Вайсковая служба: першай справай самалёты...

Другім гучным чытаннем стала абмеркаванне законапраекта «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб вайсковых абавязках і вайсковай службе», які прадстаўляў міністр абароны Юрый Жадобін.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Аляксандр Зазуля** адразу ж прапанаваў улічыць у законапраекце сітуацыю, якая здарылася з яго выбаршчыкам. «За два тыдні да заканчэння тэрміновай службы салдат атрымаў траўму — зламаў нагу. Ён дэмабілізаваўся і з-за часовай непрацаздольнасці не змог быць прыняты на месца працы, з якога быў прызваны ў армію. У выніку малады чалавек паўгода ўжо не атрымлівае выплаты па бальнічным лісце, не можа ўладкавацца на працу і, па-сутнасці, не мае сродкаў для існавання, калі не лічыць страхавую выплату, якая склала менш за мільён рублёў», — расказаў жыццёвую гісторыю дэпутат, але міністр палічыў яе прыватным выпадкам.

Не пагадзіўся міністр і з думкай **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Аляксандра Мякінніка,** які прапанаваў прадугледзець адтэрміноўку маладым спецыялістам, якія па размеркаванні накіраваны ў сельскую мясцовасць. «Дзяржаве вельмі патрэбны маладыя ўрачы, настаўнікі і іншыя спецыялісты, аднак яны пасля заканчэння ВНУ працаўладкоўваюцца, а праз два-тры месяцы іх прызываюць на вайсковую службу, а потым яны ўжо больш на гэтае месца працы не вяртаюцца», — абазначыў праблему дэпутат. На што Юрый Жадобін запярэчыў: «Такая норма супярэчыць прыярытэту вайсковай службы. Замацоўваць на працоўным месцы трэба іншай матывацыяй».

У выніку таго, што наша заканадаўства мае 55 палажэнняў, якія прадугледжваюць адтэрміноўку ад вайсковай службы, з 240 тысяч рэзервістаў (мужчын з 18 да 27 гадоў) 160 тысяч маюць права на адтэрміноўку ад вайсковай службы для атрымання вышэйшай адукацыі і больш за 35 тысяч — па стане здароўя і сямейным становішчы... Такім чынам штогод прызваць 23 тысячы здаровых маладых людзей становіцца вялікай праблемай, прызнаўся міністр абароны.

Немэтазгоднай назваў Юрый Жадобін і прапанову **Зінаіды Мандроўскай, намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях,** даць магчымасць адпачынку ваеннаслужачым, якія былі прызваны падчас завочнага навучання, на час экзаменацыйнай сесіі без уключэння гэтага часу ў тэрмін службы.

«Два гады таму мы, улічваючы дэмаграфічную сітуацыю, прадугледзелі ў законе магчымасць прызыву завочнікаў, далі пры гэтым адтэрміноўкі для пагашэння крэдыту за вучобу і іншыя ўмовы, — нагадала дэпутат. — Магчымасць працягваць вучобу падчас службы падніме прэстыж вайсковай службы і скароціць выпадкі ўхілення ад яе». Аднак міністр патлумачыў, што вайсковая падрыхтоўка прадугледжвае складанне ў звод, роту, батальён... Таму перыядычная адсутнасць вайскоўца будзе шкодзіць вайсковай справе.

Разам з тым, з некаторымі прапановамі дэпутатаў міністр усё ж такі пагадзіўся і паабяцаў улічыць іх пры падрыхтоўкі законапраекта да другога чытання. Напрыклад, вярнуць норму аб адтэрміноўцы вайсковай службы пры неабходнасці выхавання дзіцяці да 18 гадоў, калі яго маці мае ІІ групу інваліднасці (законапраект прадугледжвае такую адтэрміноўку толькі пры І групе інваліднасці ў маці).

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## РЭГІСТРАЦЫЯ УЧАСТКАЎ ОПТАМ — ЗНАЧНА ТАННЕЙШАЯ

**Сёлета плата за дзяржаўную рэгістрацыю зямельных участкаў, што прадастаўлены для вядзення сельскай ці падсобнай сельскай гаспадаркі, можа быць паменшана ўдвая, паведамілі ў Дзяржаўным камітэце па маёмасці Беларусі.**

Такая льгота па тарыфах аплаты за рэгістрацыю пачынае дзейнічаць пры падачы заявы на рэгістрацыю адначасова больш чым 20 зямельных участкаў. Пра гэтую норму гаворыцца ў адпаведнай пастанове Саўміна № 234 ад 29 сакавіка 2013 г. Такім чынам, пры падачы больш як 20 заяў аб дзяржрэгістрацыі стварэння зямельных участкаў істотная льгота па тарыфах пачынае дзейнічаць пры рэгістрацыі 21-га і кожнага наступнага зямельнага ўчастка. Гэтае новаўвядзенне галоўным чынам тычыцца сельскагаспадарчых арганізацый, якія да 1 студзеня 2014 года вырашаць правесці масавую рэгістрацыю сельскагаспадарчых земляў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ПАДАЗРАВАНУЮ Ў ЗАБОЙСТВЕ ЎЛАСНЫХ ДЗЯЦЕЙ ЗНАЙШЛІ МЁРТВАЙ

**Аб гэтым «Звяздзе» паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама.**

Труп жанчыны знайшоў дачнік... на ўласным участку ў садовым таварыстве, што за некалькі кіламетраў ад Салігорска. Аб сваёй шакіруючай знаходцы ён адразу ж паведаміў у міліцыю. Праваахоўнікі, якія прыбылі на месца, папярэдне ўстанавілі, што загінулая жанчына — 23-гадовая жыхарка Салігорска, якая знікла летась у снежні і была аб'яўлена ў вышук. Прычына смерці пакуль невядома, будзе праводзіцца геномная экспертыза.

Нагадаем, што 10 снежня ў Салігорску ў ванне сваёй кватэры рабочы таварыства «Беларуськалій» знайшоў мёртвымі 3-гадовую дачку і гадавалага сына. Згодна з заключэннем экспертаў, дзяцей утапілі ў ванне. Салігорскі раённы аддзел Следчага камітэта завёў крымінальную справу. У забойстве малалетніх дзяцей абвінавачваецца іх 23-гадовая маці, якая на момант здарэння знаходзілася ў дэкрэтным адпачынку.

**Надзея ДРЫЛА.**

## АД ЧАГО ЗАГІНУЛА РЫБА?

**На «гарачую лінію» Камітэта дзяржкантролю Брэсцкай вобласці паступіў званок аб тым, што ў рыбгасе «Сакалова» Жабінкаўскага раёна масава гіне рыба. Спецыялісты КДК выехалі на месца і ўбачылі вынік вялікага мору.**



Фота КДК.

На адным з вадаёмаў поўнасцю не сышоў лёд. Рухаючыся на лодцы ад крыгі да крыгі, работнікі гаспадаркі збіралі мёртвую рыбу. Паводле слоў супрацоўніка абласнога камітэта Віктара Васілеўскага, на вока маштабы памору ацаніць цяжка, але гаворка ідзе пра дзясяткі тон мёртвага карпа і іншых відаў рыбы. Загінула таварная рыба двух-трох гадоў. Як папярэдне высветлілася, увосень прадпрыемства не здолела прадаць гатовы тавар, і ў вадаём, разлічаны на 13 тон, запусцілі больш за 60 тон рыбы. А зіма была доўгай. Вось рыба і не вытрымала, пачала гінуць. Пачаліся праверкі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## МІНСК УСЁ Ж ТАКІ БЯСПЕЧНЫ

**Некаторыя інтэрнэт-рэсурсы распаўсюдзілі інфармацыю пра Мінск як пра адзін з самых небяспечных гарадоў Еўропы — на падставе колькасці наўмысных забойстваў. Са спасылкай на сайт Упраўлення ААН па наркотыках і злачыннасці паведамлялася, што ў беларускай сталіцы на 100 тысяч насельніцтва прыпадае 5,7 такіх злачынстваў.**

Як паведамляюць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, летась у Мінску ўчынена 49 забойстваў (2,6 на 100 тыс. насельніцтва). Больш за тое, згодна з дзейным парадкам уліку, да ўвагі прымаюцца і замахі. Такім чынам, у 49 зарэгістраваных забойстваў уключана 13 выпадкаў замаху на жыццё, ад якіх фактычна ніхто не загінуў. А на сайце УНЗ ААН была размешчана недакладная інфармацыя за 2009 год, заснаваная на памылковых на той момант звестках аб насельніцтве Мінска. Памылка выпраўлена.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

■ На кантролі

## ДЗЯРЖАЎНАЯ ДАПАМОГА — ПОЎНАЯ І СВОЕЧАСОВАЯ

**Камітэт дзяржаўнага кантролю Магілёўскай вобласці выявіў шэраг парушэнняў у сферы выплаты дзяржаўных грашовых дапамог.**

Гэта стала вынікам правядзення «гарачай лініі», дзе абмяркоўваліся праблемы своечасовай выплаты і паўнаты дапамог. Напрыклад, толькі пасля звароту ў КДК жанчын з ААТ "Вяснянка" 148 работніц гэтага магілёўскага прадпрыемства здолелі атрымаць законную дапамогу па доглядзе дзяцей на суму амаль 39 мільёнаў рублёў. Жыхарцы Шклоўскага раёна мясцовы льнозавод увогуле завінаваціўся «круглую» суму. Але не штодзённы тэлефанаванні на працягу паўтара месяца наймальніку і бухгалтару засталіся безвыніковымі. Пасля ўмяшання Камітэта дзяржкантролю заяўніцы выплацілі дапамогу па цяжарнасці і родах у памеры 18 мільёнаў рублёў.

Між тым найбольшая колькасць зваротаў, адзначаецца ў паведамленні для прэсы КДК Магілёўскай вобласці, звязана з недастатковай інфармаванасцю і няведаннем грамадзянамі заканадаўства аб парадку прызначэння і выплаты дзяржаўных грашовых дапамог. Гэта выявілася ў 15 тэлефанаваннях, альбо ў 68% ад агульнай колькасці. Усе звароты са звесткамі аб парушэннях пры выплаце дапамог накіраваны ў Магілёўскае абласное ўпраўленне Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага аблвыканкама — для разгляду і прыняцця мер. Іх выкананне будзе кантралявацца. На «гарачую лінію» паступілі 22 тэлефанаванні, а рэальная дапамога была аказана 152 сем'ям. Ім выплачана каля 68 мільёнаў рублёў.

**Ілона ІВАНОВА**

■

## ПАВОДКА: чакаем другі этап

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёлета ўжо расчышчана 1,6 тысячы квадратных метраў лядовага покрыва. Рызыка падтаплення талымі водамі на гэтым тыдні яшчэ прагназуецца па цэнтральных і паўночных рэгіёнах нашай краіны. Актыўная фаза развіцця паводкі ў басейне ракі Сож захаваецца ў бліжэйшыя 3-5 дзён, у сувязі з чым чакаецца новае падтапленне на тэрыторыі Магілёўскай і Гомельскай абласцей. Хуткае раставанне снегу ў цэнтральнай і паўночнай частках краіны забяспечыць рост узроўню вады ў басейнах рэк Днепр і Заходняя Дзвіна. Зараз назіраецца першы этап паводкі, які звязаны з басейнамі паўднёвых рэк, што мяжуюць з Украінай. Чакаецца яшчэ другі этап — выхад з берагоў рэк, якія ідуць з Расіі.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

# У ДЗІЦЯЧЫ САД — ПРАЗ ІНТЭРНЭТ


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Раней гучалі прапановы ўвесці дыферэнцаваную плату ў залежнасці ад даходаў сям'і або перайсці на прынцыпова новы падыход да аплаты за ўтрыманне дзіцяці ў дашкольнай установе, калі кошт будзе залежаць ад якасці паслугі. Але грамадскасць (у тым ліку і педагагічная) да гэтага яшчэ не падрыхтавана, таму пакуль што спыніліся на паэтапным павелічэнні фінансавага ўдзелу бацькоў у аплаце харчавання дзяцей.

— Сёння магчымасці павышаць плату за дзіцячы садок вялікімі тэмпамі няма. Але гэтае пытанне на парадку дня ўсё роўна застаецца, паколькі ўтрыманне дзіцяці ў дашкольнай установе кладзецца вялікім цяжарам на бюджэт, — падкрэсліла Галіна Макаранкава.

Таксама Галіна Макаранкава паведаміла, што ў бліжэйшы час грашовыя нормы на харчаванне дзяцей ва ўстановах дашкольнай адукацыі будуць пераглядацца ў бок павышэння — адпаведны праект дакумента ўжо падрыхтаваны. А, як вядома, бацькоўская плата за дзіцячы садок залежыць ад устаноўленых грашовых нормаў на харчаванне: калі павышаюцца грашовыя нормы на харчаванне выхаванцаў, прапарцыянальна павышаюцца і выдаткі бацькоў.

Пэўную дапамогу ў вырашэнні праблемы дэфіцыту месцаў у дзіцячых садках могуць аказаць прадпрымальнікі. Зараз Міністэрства адукацыі па даручэнні ўрада распрацоўвае нарматыўны акт аб стымуляванні развіцця ўстаноў дашкольнай адукацыі прыватнай формы ўласнасці. Пакуль што ў Беларусі дзейнічае ўсяго 9 прыватных устаноў, якія рэалізуюць праграму дашкольнай адукацыі.

— Для іх прадугледжаны шэраг падатковых ільгот: вызваленне ад падатку на дабаўленую вартасць, падатку на прыбытак, нерухомасць, ад зямельнага падатку. Можа прымяняцца таксама паніжальны каэфіцыент пры арэндзе памяшканняў, у тым ліку на бясплатнай аснове. Да таго ж заканадаўства дазваляе пакрываць частку выдаткаў такіх устаноў за кошт мясцовых бюджэтаў, — дадала Галіна Макаранкава.

Вось толькі знаходжанне дзіцяці ў прыватным садку абыходзіцца іх бацькам намнога даражэй — да 500 долараў. Ці не таму з 9 прыватных устаноў 8 размешчаны ў Мінску?

Перспектыўнай формай работы ў міністэрстве лічаць таксама развіццё адукацыйных паслуг з кароткатэрміновым знаходжаннем дзяцей: адкрыццё адаптацыйных груп і мацярынскіх школ для дзяцей, якія не наведваюць дзіцячы сад. Зараз у дзяржаўных садках групы з кароткатэрміновым знаходжаннем наведваюць каля 14,4 тысячы дзяцей. Адукацыйныя паслугі (ад 1 да 2 гадзін на дзень) аказваюць таксама 18 прыватных арганізацый і 53 індывідуальныя прадпрымальнікі.

Па запатрабаванні сем'яў функцыянуюць і 17 сямейных дзіцячых садоў — усе яны размешчаны ў сельскай мясцовасці. Як правіла, такія малакалькасныя садкі адкрываюцца там, дзе супадаюць інтарэсы бацькоў, мясцовых органаў кіравання адукацыяй і ёсць педагог, гатовы рэалізоўваць праграму дашкольнай адукацыі.

У Беларусі знята забарона і на размяшчэнне дашкольных устаноў у памяшканнях жылых дамоў. Ёсць меркаванне, што невялікія дзіцячыя садкі (на 40-50 чалавек) хутчэй забяспечаць у буйных гарадах крокавую даступнасць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ З нагоды

# КАЛІ ЛЮДЗІ І НАВАКОЛЛЕ — РАЗАМ

## Сёння — Міжнародны дзень аховы помнікаў і гістарычных мясцін

**А гэта значыць, нас чакае больш за 100 бясплатных экскурсій на працягу некалькіх дзён, прэзентацыі розных валанцёрскіх летнікаў ды і проста пільная ўвага да ўсяго цікавага і гістарычнага, што знаходзіцца побач.**


Фота Аляксандры КАНОНЧАНКІ.

### Колькасць бясплатных экскурсій зашкальвае!

Фэст экскурсаводаў — адмысловая беларуская падзея, прымеркаваная да гэтага дня. Пра яго расказаў **прадстаўнік Беларускага камітэта Міжнароднай рады па помніках і мясцінах (ICAMOS) Павел КАВАЛЁЎ:**

— Так атрымліваецца, што ў нашай краіне людзі жывуць уласнымі клопатамі, а на помнікі ўвагу звяртаюць рэдка. Калі і адбываецца іх знаёмства, то на шкоду самому помніку. Таму галоўная ідэя фэсту — прыцягненне ўвагі людзей да помнікаў, якія знаходзяцца проста побач, з якімі яны сутыкаюцца кожны дзень, пастаянна іх бачаць, але не разумеюць каштоўнасці. Таму мы актыўна запрашаем на гэтыя экскурсіі мясцовых жыхароў. І я раіў бы ўсім наведваць экскурсіі менавіта ў сваім раёне — вобразна кажучы, адкрыць вочы на родныя мясціны.

На сёлетнім фэсце экскурсаводаў колькасць экскурсій ужо зашкальвае. Толькі па Мінску будзе праведзена больш за 50 экскурсій. І яшчэ каля 50 у рэгіёнах. Ва ўсіх абласных цэнтрах будуць ладзіцца свае экскурсіі, а ў Брэсце і Гродне — нават уласны міні-фэст. Сярод рэгіёнаў, што далучыліся да гэтай падзеі, — Полацк, Орша, Маладзечна, Астравец і іншыя. Даволі незвычайнымі падаюцца дзве экскурсіі па нетурыстычным Нясвіжы.

Некалькі гадоў таму з'явіліся храмавыя экскурсіі — іх звычайна праводзяць самі святары. Вельмі папулярнымі з'яўляюцца велапедныя экскурсіі. Ладзіцца, напрыклад, «Велапрабег па мясцінах Чапскіх» (Чапскі быў адным з мэраў-губернатараў Мінска, ён зрабіў велатрэк). Будзе праведзена і тры экскурсіі знарок для дзяцей.

Добрай традыцыяй стала праведзенне экскурсій па-за межамі нашай краіны. Напрыклад, па беларускай Празе — мясцінах, звязаных з Францыскам Скарынам. Сёлета будуць экскурсіі таксама па Вільні і Варшаве.

Арганізатары адзначаюць, што ім вельмі хацелася б, каб іх ідэя фэсту экскурсаводаў пашыралася і ў іншых краінах. Аказваецца, у свеце такой з'явы, як фестываль бясплатных экскурсій, няма — у гэтым мы першыя.

### Працы на любы густ

Беларуская асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА, зразумела, таксама не абмінула Міжнародны дзень аховы помнікаў і гістарычных мясцін. Старшыня арганізацыі Дзмітрый Субцэльны слушна заўважыў:

— Аб'ектаў, якім патрэбна ахова, — тысячы ў нашай краіне. І ў любым раёне ці горадзе сіламі добраахвотнікаў — мясцовых органаў улады, школьнікаў, студэнтаў ці працоўных людзей, любых ініцыятыў — магло б праводзіцца іх добраўпарадкаванне. Варта ладзіць летнікі проста на месцах, і гэта не патрабуе нейкіх каласальных грошай. Агульнымі грамадскімі намаганнямі штосьці рабіць, мяняць, развіваць і захоўваць — гэта рэальна.

Беларуская асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА напярэдадні Дня аховы помнікаў прапанавала сваю праграму на гэтае лета тым, хто жадае неяк практычна дапамагчы Бацькаўшчыне. З 20 ліпеня па 2 жніўня ўжо пяты раз будзе ладзіцца валанцёрскі летнік у вёсцы Залессе Смаргонскага раёна на тэрыторыі палаца Міхала Клеафаса Агінскага і прылеглага да яго парку. Валанцёрам прапануюцца добраўпарадкаванне тэрыторыі, будаўнічыя і паркавыя работы, раскопкі. З 10 па 24 чэрвеня можна паўдзельнічаць у археалагічных раскопках на тэрыторыі парку Альба, які знаходзіцца ў Нясвіжы ля рэзідэнцыі князёў Радзівілаў. А з 27 ліпеня па 7 жніўня будзе ладзіцца летнік на тэрыторыі палаца Сапегаў у г.п. Ружаны Брэсцкай вобласці. Тут давядзецца працаваць у сутарэннях палаца, удзельнічаць у раскопках, добраўпарадкаванні тэрыторыі, а таксама дапамагаць у будаўніча-рэстаўрацыйных работах, што неўзабаве пачнуцца ў тэатральным корпусе палаца. Унёсак за ўдзел у летніку ад кожнага валанцёра — 200 тысяч рублёў. Працаваць давядзецца 5 гадзін на дзень, астатні час — культурная праграма, якая загадзя прадумана арганізатарамі. Як паведаміў спадар Субцэльны, адміністрацыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі мае намер арганізаваць летнік у Быхаўскім замку Магілёўскай вобласці. Сёлета там пачынаюцца рэстаўрацыя і археалагічныя раскопкі.

### Там, дзе шчыруе талака

Ёсць яшчэ шмат ініцыятыў і праектаў, прысвечаных Міжнароднаму дню аховы помнікаў і гістарычных мясцін. Напрыклад, Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры з гэтай нагоды прапануе пашчыраваць на карысць Бацькаўшчыны ў адны з выхадных мая. Яны будуць ладзіць чарговую талаку па добраўпарадкаванні рыма-каталіцкіх могілак побач з руінамі былога даміканскага касцёла ў мястэчку Зембін Барысаўскага раёна — 18 мая.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

■

■ Ну і ну!

## Скралі... воданапорную вежу

**У в. Савінічы Клімавіцкага раёна скралі воданапорную вежу, якая належала КСУП «Ціманава», паведамілі ва ўпраўленні СК па Магілёўскай вобласці Беларусі.**

29-гадовы і 21-гадовы жыхары Клімавіцкага раёна, раней судзімыя, пры дапамозе электразваркі разрэзалі двухтонную канструкцыю воданапорнай вежы, каб прадаць скупшчыкам металу. Завяршыць задуманае правапарушальнікі не паспелі — іх затрымалі на месцы злачынства супрацоўнікі міліцыі па ахове тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання Клімавіцкага РАУС. Гэтая воданапорная вежа ўжо некалькі гадоў не функцыянавала і знаходзілася на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання (у зоне адсялення). Заведзена крымінальная справа.

**БЕЛТА**

■

РРБ-Банк

**Закрытое акционерное общество «Акционерный банк реконверсии и развития»**

220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18

**www.rrb.by**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2013 г.**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.04.2013 | на 01.04.2012 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 44 545,3 | 29 691,8 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 411 599,0 | 299 682,5 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 11 882,4 | 19 578,9 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 15 125,5 | 40 328,2 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 393 505,7 | 292 314,8 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 122 073,6 | 119 494,9 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 26 184,2 | 25 974,8 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 5 434,7 | 5 436,0 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 8 997,7 | 6 876,7 |
| **13** | **ИТОГО активы** | **11** | **1 039 348,1** | **839 378,6** |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 109 769,7 | 108 444,8 |
| 16 | Средства банков | 1202 | 71 658,2 | 88 503,6 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 673 561,5 | 479 854,5 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 31 473,9 | 29 268,1 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 12 570,5 | 11 543,9 |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 5 707,3 | 1 864,3 |
| **21** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | **904 741,1** | **719 479,2** |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 55 768,7 | 55 768,7 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | 3 520,5 | 3 520,5 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 17 379,6 | 15 195,0 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 57 938,2 | 45 415,2 |
| **28** | **ВСЕГО капитал** | **121** | **134 607,0** | **119 899,4** |
| **29** | **ИТОГО обязательства и капитал** | **12** | **1 039 348,1** | **839 378,6** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2013 года**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.04.2013 | на 01.04.2012 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 26712,3 | 27681,0 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 19328,2 | 22599,5 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 7384,1 | 5081,5 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 15870,4 | 10960,4 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 719,3 | 534,3 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 15151,1 | 10426,1 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (13,4) | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 2166,2 | 8730,6 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (88,5) | (5372,8) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 3575,5 | 2018,1 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 1754,5 | 879,3 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 15765,2 | 12764,3 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 1706,3 | 1238,5 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 5307,0 | 3723,8 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | 949,3 | 155,2 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 4357,7 | 3568,6 |
| **18** | **Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях** | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | |

**И.о. Председателя Правления Н.К. Юркевич**
**Главный бухгалтер Т.И. Карчмит**
**Дата подписания «15» апреля 2013 г.**

*Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 21 от 31.01.2008. УНП 100361187.*

# ЧАЛАВЕК ПАСЛЯ ІНСУЛЬТУ.
## Чым дапаможа сацыяльная служба?

**Інсульт звычайна застае знянацку і таго, хто захварэў, і яго родных. І адразу значна змяняе жыццё ўсёй сям'і. З-за страты функцый нервовай сістэмы хворы нярэдка вымушаны зноўку вучыцца хадзіць, размаўляць, абслугоўваць сябе. І, вядома, немалая дадатковая нагрузка кладзецца на плечы яго блізкіх. Чым можа дапамагчы сям'і ў такой няпростай сітуацыі сацыяльная служба? Размаўляем на гэтую тэму з дырэктарам Баранавіцкага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Вольгай ЗЯНЬКЕВІЧ.**

### Адразу пасля бальніцы

— Пачнём з таго, што пасля выпіскі з бальніцы можна змясціць такога хворага ў хоспіс у вёсцы Новая Мыш, які прызначаны ў тым ліку і для вышэйзгаданай катэгорыі хворых. На працягу 14 дзён ён будзе атрымліваць там паўнавартасны догляд на бязвыплатнай аснове. Гэта вельмі добры варыянт, таму што ёсць такія паслугі, якія могуць аказваць толькі медыкі, — распавядае Вольга Леанідаўна. — Акрамя гэтага, у Баранавіцкім раёне ёсць тры бальніцы сястрынскага догляду. Калі ж чалавек хоча заставацца дома, наша служба можа прапанаваць яму паслугі пагадзіннага дзённага догляду.

### Калі хворы ўжо дома

У такой сітуацыі перш за ўсё трэба вызначыцца, як далей дзейнічаць, лічыць наша суразмоўніца. «Таму на месца выязджаюць наш спецыяліст разам з загадчыцай аддзялення і вывучаюць сітуацыю, — тлумачыць яна. — Ёсць сем'і, дзе сваякі гатовы самі даглядаць, але просяць навучыць, як правільна гэта рабіць. І нашы супрацоўнікі кансультуюць іх. Звычайныя людзі шмат чаго могуць не ведаць. Напрыклад, як памыць галаву ляжачаму хвораму, як памяняць яму памперс ці прасціну, як правільна апрацоўваць пролежні. Калі ж неабходна дапамога сядзелкі, то нашы спецыялісты высвятляюць розныя аспекты жыцця хворага, аж да яго звычак: калі ўстае чалавек, калі яго лепш наведваць... Неабавязкова знаходзіцца з хворым цэлы дзень, але, тым не менш, у пэўныя моманты хтосьці павінен быць з ім побач. Напрыклад, у нас была бабуля, якая рана прачыналася, і ўжо ў 8 гадзін раніцы нашаму супрацоўніку трэба было быць у яе. А была такая, якая прачыналася бліжэй да гадзіны дня...».

Часта бывае так, што дапамога хвораму патрэбна на нейкі канкрэтны перыяд, а потым ён ідзе на папраўку. Паслугі сядзелкі далей ужо не патрэбны, дастаткова прыходу сацработніка. У Баранавіцкім гарадскім ЦСАН ёсць тры спецыялісты, якія аказваюць такія паслугі. Таксама ўведзена стаўка сядзелкі па доглядзе асоб, якія страцілі рухальную актыўнасць. Яе дапамогай могуць скарыстацца адзінокія пажылыя людзі.

Акрамя таго, Баранавіцкі гарадскі ЦСАН, пачынаючы з 2004 года, супрацоўнічае са службай занятасці. «Існуе такая форма падтрымкі беспрацоўных грамадзян, як грамадска карысная праца. Мы залічваем такіх беспрацоўных у штат, яны працуюць у нас сядзелкамі і атрымліваюць зарплату ад Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва, — тлумачыць дырэктар ТЦСАН. — Цяпер у нас працуе 6 такіх сядзелак».

### Каляска ў часовае карыстанне

Ёсць у Баранавіцкім гарадскім ЦСАН і пункт выдачы сродкаў рэабілітацыі ў часовае карыстанне. «Пакуль чалавек атрымае заключэнне аб тым, што ён мае патрэбу ў інвалідная калясцы, можа прайсці час, — кажа наша суразмоўніца. — А мы даём у часовае бясплатнае карыстанне па адпаведным дагаворы сродкі рэабілітацыі людзям пасля інсульту, інфаркту, пасля пераломы шыйкі сцягна... Калі ў нас ёсць у наяўнасці памперсы, аказваем людзям і такую дапамогу. Сродкі на памперсы пакрываюцца па праграме адраснай сацыяльнай дапамогі, але чалавеку могуць не даць адразу I групу інваліднасці. Таму мы стараемся падтрымаць яго, бясплатна выдзяляючы неабходныя сродкі гігіены».

Сацыяльная служба наладзіла добрае ўзаемадзеянне з цэрквамі, рэлігійнымі арганізацыямі. І гэтае супрацоўніцтва толькі на карысць цяжка хворым людзям, якія як ніхто іншы, маюць патрэбу ў духоўнай падтрымцы. А яшчэ з ліпеня 2008 года ў горадзе прадастаўляюцца паслугі сацыяльнага таксі. Машына, што немалаважна, абсталявана электрапад'ёмнікам.

### І даглядаюць, і працуюць

— Дзяржава таксама дае сям'і з цяжка хворым магчымасць аформіць кагосьці з блізкіх сваякоў у якасці чалавека, які ажыццяўляе догляд гэтага хворага, што дае права на заробак у памеры пражытковага мінімуму (цяпер гэтая сума складае 924.150 рублёў). Пры гэтым сваяку ідзе працоўны стаж, — адзначае Вольга Зянькевіч. І дадае, што ў апошні час у горадзе гэтай магчымасцю скарысталіся многія.

Так што варыянты атрымаць не толькі медыцынскую дапамогу, але і падтрымку з боку сацыяльнай службы ў людзей, якія перанеслі цяжкае захворванне, у тым ліку і інсульт, ёсць. Але ўсё ж Вольга Зянькевіч глыбока перакананa, што пры гэтым ніколі нельга здымаць адказнасць і з радні. «Сям'і трэба быць гатовай да такой сітуацыі ў жыцці», — лічыць яна.

**Святлана БУСЬКО**, *Баранавіцкі раён.*

### «НЕ ПАГАРДЖАЙЦЕ РЭКАМЕНДАЦЫЯМІ ДОКТАРА»

**Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Беларусі Таццяна МІГАЛЬ:**

*— У краіне ў 2012 годзе захавалася тэндэнцыя да зніжэння смяротнасці ад інсульту, але, разам з тым, ідзе яго «амаладжэнне». Распаўсюджанасць сасудзістай паталогіі галаўнога мозга, высокая лятальнасць і інвалідызацыя патрабуюць пошуку новых падыходаў да тэрапіі і прафілактыкі.*

*Ва ўсіх арганізацыях аховы здароўя ўкараняюцца меры па прафілактыцы інсультаў, ранняга вызначэння фактараў рызыкі, дыягностыцы мінімальных парушэнняў у стане здароўя і аказання медыцынскай дапамогі ў поўным аб'ёме тым, у каго здарылася бяда, незалежна ад месца жыхарства. Усе бальніцы, нават самыя маленькія, маюць аддзяленні рэанімацыі або палаты інтэнсіўнай тэрапіі, а медыцынскі персанал дзейнічае дакладна ў адпаведнасці з распрацаваным і ўкаранёным у рэспубліцы алгарытмам аказання медыцынскай дапамогі тым, хто перанёс інсульт.*

*Аднак самае галоўнае — гэта прафілактыка, недапушчэнне развіцця захворвання. І тут варта адзначыць нізкі ўзровень прыхільнасці насельніцтва да здаровага ладу жыцця, лячэння артэрыяльнай гіпертэнзіі і ішэмічнай хваробы сэрца сярод асоб працаздольнага ўзросту. Як паказваюць даследаванні, з памерлых ад хвароб сістэмы кровазвароту ў працаздольным узросце рэгулярна наведвалі доктара каля 30% (з іх рэкамендацыі выконвалі толькі 15%), 28% не наведвалі доктара і 42% наведвалі яго нерэгулярна. Нярэдка прычына развіцця захворвання з цяжкімі наступствамі — нявяка на абследаванне, няглядзячы на паўторныя выклікі, пагарджэнне рэкамендацыямі ўрача, самалячэнне.*

*Між тым, добры эфект ад мер, якія прымаюцца, і медыцынскай дапамогі можа быць толькі пры вядзенні здаровага ладу жыцця, выкананні рэкамендацый доктара і разумным стаўленні да свайго здароўя.*

## Завод збіраецца на суботнік

**Традыцыя праводзіць увесну штогадовы суботнік захавалася на беларускай зямлі з савецкіх часоў. Заробленыя на ім грошы пералічваюцца на карысць разнастайных дзяржаўных арганізацый — медычных устаноў, дзіцячых лагераў, музеяў... Тон у гэтым задаюць флагманы беларускай эканомікі. Адзін з іх — Мінскі завод колавых цягачоў.**

«Звязда» пацікавілася ў намесніка генеральнага дырэктара прадпрыемства па ідэалагічнай працы і кадрах Паўла Огера, як пройдзе сёлета суботнік на МЗКЦ.

— Нашы работнікі зоймуць пераважна свае звычайныя працоўныя месцы, выконваючы вытворчыя заданні. Таксама скамплектавана група са 150 чалавек, якія зоймуцца добраўпарадкаваннем тэрыторыі прадпрыемства. Будуць фарбаваць бардзюры, бяліць дрэвы і наносіць разметку на ўнутрызаводскіх дарогах. 20 красавіка плануем зарабіць грошай столькі, як і ў звычайны працоўны дзень. Атрыманая сума будзе пералічана ў агульнарэспубліканскі фонд суботніка. Ужо вядома, на якія мэты ім там патрацяць. Палова ад пералічаных сродкаў пойдзе на патрэбы Міністэрства аховы здароўя. Астатнія грошы гарадскі выканаўчы камітэт выдаткуе на падрыхтоўку аздараўленчых дзіцячых лагераў да летняга сезона. Для нас гэта асабліва важна, бо на балансе завода знаходзіцца ўласны летні дзіцячы лагер адпачынку «Змена» ў вёсцы Волма Смалявіцкага раёна. І «Змена» дзякуючы суботніку таксама адчуе нашу дапамогу

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

■ Пуцяводная зорка

# МАМІНА ШКОЛА

**Трапіўшы падчас аднаго з мерапрыемстваў у аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў Чэрвеньскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, я звярнула ўвагу на вельмі абаяльную жанчыну — кіраўніка двух гурткоў Святлану Акіншаву. І... адразу захапілася ye ўменнем абыходзіцца з дзеткамі — асаблівымі, хатнімі, капрызлівымі з-за хвароб, яе майстэрствам — вырабамі ў розных тэхніках, яе педагагічнымі здольнасцямі. А яшчэ — усмешлівасцю, таварыскасцю, лёгкасцю ў стасунках з людзьмі любога ўзросту. Зразумела, захацелася сустрэцца, пагутарыць. Якім жа было маё здзіўленне, калі высветлілася, што Святлана Акіншава атрымала ў свой час толькі... спецыяльнасць закройшчыцы. А да ўсяго астатняга дайшла-дадумалася сама: прымусіла жыццё.**



Святлана АКІНШАВА са сваімі гуртоўцамі і сумеснымі работамі.

Старэйшы сын Святланы, Уладзіслаў, пакутуе на цяжкае захворванне. Якія намаганні патрэбна было прыкласці, каб выхадзіць, развіць яго, — ведае толькі яна сама.

Калі для Уладзіка прайшла пара наведваць дзіцячы садок, Святлана занялася найперш развіццём дробнай маторыкі яго рук. Сама прыдумляла і вырабляла розныя цацкі (вось дзе спатрэбіліся навыкі закройшчыцы!), займалася з Уладзікам зборам канструктара, дзе шмат дробных дэталяў. Затым перайшлі да бісеру. У дзіцячым садку №1 г.Чэрвеня з выхавальніцамі Святлана наладзіла творчае супрацоўніцтва. Дапамагала ў вырабе тэатральных касцюмаў, развіваючых гульняў. Развівала дзіця — і развівалася сама.

У сям'і, дзе гадавалася Святлана, яе сёстры і брат, усе дзеці былі таленавітымі, цікаўнымі і творчымі. З гэтым і ідуць па жыцці. Таму Святлана, калі прыйшла працаваць у аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў, стала для яго сапраўдный знаходкай. І справа не толькі ў тым, што яна валодае шмат якімі тэхнікамі і адкрывае для сябе з дапамогай інтэрнэту ўсё новыя і новыя. Галоўнае — яна любіць дзяцей, умее абыходзіцца з самымі капрызлівымі, можа навучыць іх многаму. Між іншым, для гэтай катэгорыі гуртоўцаў часта праблемна выканаць самае простае дзеянне — адмераць і адрэзаць патрэбны кавалак танюсенькага дроту, скруціць адпаведным чынам, абматаць ніткамі альбо нанізаць на яго бісер. І самы маленькі поспех тут успрымаецца як самая вялікая ўдача, перамога над сабой.

**Што ж датычыцца прынцыпаў у выхаванні, дык Святлана стараецца залішне не кантраляваць сыноў, не апякаць іх, хаця гэта і няпроста.**

Памятаю, як падчас мерапрыемства ў аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў мяне ўразіла, як грунтоўна і падрабязна распавёў пра тэхніку пап'е-машэ і прадэманстраваў частку працэсу сын Святланы Уладзік. У адказ на маю захопленасць яна патлумачыла, што любы з наведвальнікаў гуртка, калі ён валодае маўленнем, можа гэта зрабіць. Бо падчас заняткаў усё прагаворваецца ўслых. Праўда, бывае, што на наступны дзень гуртоўцы ўжо і не памятаюць нічога. Таму даводзіцца ўсё паўтараць спачатку, 20 разоў — значыць, 20...

Лёгкая ў стасунках, Святлана Акіншава мае шмат сяброў. Кажа, што тыя з іх, у каго здаровыя дзеткі, часта робяць з імі хатнія заданні з крыкамі, на нервах. І вельмі здзіўляюцца яе цярплівасці. Маўляў, як можна адно і тое ж паўтараць столькі разоў — і не павысіць голас? Уласная школа, усміхаецца мая суразмоўца.

Апрача ўсяго іншага, цікава было пачуць ад Святланы пра асобныя моманты ў выхаванні двух сыноў — Уладзіслава і Святаслава — і пра тое, якая яна гаспадыня. У выхадныя збіраюцца ўтраіх. Сыны добра ведаюць сваю справу — абабраць бульбу, памыць і пачысціць гародніну, нарэзаць яе для салаты...

Тут вельмі радуюцца прыезду Святланіных бацькоў з вёскі Ляды Чэрвеньскага раёна. Дарэчы, туды сям'я Акіншавых пераехала з Краснаполля Магілёўскай вобласці пасля аварыі на ЧАЭС — у тым жа 1986-м. Ды так і прыжылася на Чэрвеньшчыне. Пётр Іванавіч і Любоў Аляксандраўна любяць наведваць сваіх дзяцей і ўнукаў, прымаць іх у сябе. Улетку на сядзібе Акіншавых традыцыйна шмат кветак. І — працы для ўсіх дзяцей і ўнукаў! Дарэчы, гэты падворак адзначаўся ў вёсцы як самы лепшы падчас адпаведнага конкурсу.

Тата і брат Святланы забяспечваюць яе сынам неабходнае мужчынскае выхаванне, якое, па меркаванні маёй суразмоўцы, ніколі не заменіць адно толькі жаночае. Паміж мужчынамі вялікімі і маленькімі — поўнае ўзаемапаразуменне!

Што ж датычыцца прынцыпаў у выхаванні, дык Святлана стараецца залішне не кантраляваць сыноў, не апякаць іх, хаця гэта і няпроста. Усё ж мацярынскае сэрца трывожыцца і хвалюецца, асабліва за Уладзіка.

Увесь вольны час Святлана Акіншава стараецца праводзіць разам з сынамі. Яны любяць хадзіць на прагулкі. Прычым хлопчыкі абсалютна не саромеюцца, што гуляюць з мамай. Могуць і за рукі пабрацца. Яна ж падтрымлівае іх у творчых памкненнях і пачынаннях. Вось захапіўся малодшы, Святаслаў, мадэлямі самалётаў — робяць чарцяжы разам. Хаця, усміхаецца Святлана, яна не вельмі ў гэтым разбіраецца. Бывае, ноччу прачынаецца і думае: «А як лепш зрабіць тое і тое?» З Уладзікам заняткі бісерам дома — абавязкова! Хаця і стаміўся, і ўрокаў шмат, але мама настойвае... Развіццё маторыкі рук — перш за ўсё.

А ўвогуле, як кажа Святлана Акіншава, яе хлопчыкі — вельмі паслухмяныя. У школе на іх не скардзяцца. А дома яна стараецца, каб не было праблем. Хаця, вядома ж, здараецца ўсякае...

Вось такая яна, Святлана Акіншава. «Незвычайная звычайная» жанчына, якая выхавала сябе, а цяпер вучыць і выхоўвае ўласных дзяцей і сваіх гуртоўцаў.

**Святлана АДАМОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

18 КРАСАВІКА 2013 г.
ЧАЦВЕР
№ 8 (15718)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года


*Гульня як лад жыцця*

# «КВЗ ЗАБІРАЕ ЎСЁ, ШТО Ў ЦЯБЕ ЁСЦЬ. А ДОРЫЦЬ — ТОЛЬКІ АПЛАДЫСМЕНТЫ»



**Каманда КВЗ БДУ была вядомай яшчэ на мяжы 2000-х гадоў, калі імёны беларускіх «вясёлых і знаходлівых» гучалі на ўсю постсавецкую прастору. Усё ж такі дзве перамогі ў Вышэйшай лізе! Але потым была «белая пляма» ў гісторыі каманды. І толькі ў 2010 годзе каманда аднавілася дзякуючы маладым і харызматычным гульцам. Новы склад БДУ годна трымае рэпутацыю, створаную папярэднікамі, — запрашэнне ў Вышэйшую лігу КВЗ таму доказ. У гэтым годзе, на жаль, нашым «вясёлым і знаходлівым» не ўдалося прайсці далей 1/8 фіналу Вышэйшай лігі. Але ў Беларусі ўсё роўна яны застаюцца самымі любімымі і жаданымі гасцямі на розных мерапрыемствах.**



Андрэй Шумілаў — студэнт геафака БДУ і адзін з «аднаўляльнікаў» каманды КВЗ БДУ.

**— Андрэй, раскажыце, як сфарміраваўся цяперашні склад каманды?**

— Наша каманда — гэта вынік сяброўскіх адносін. Я са школы сябраваў з трыма хлопцамі, і ўжо тады мы захапляліся КВЗ. Потым паступілі ў розныя ВНУ, але захапленне гульнёй не прайшло. І як вынік — мы аб'ядналіся ў каманду «27 па Грынвічу». А ў 2010 годзе ў Першай лізе разам з камандай «Цукар» мы стварылі каманду БДУ. Цікава, што калі аб'ядноўваліся, ведалі іх толькі па жартах. І, можна сказаць, недалюблівалі. Але для дасягнення пэўных вынікаў былі вымушаны аб'яднацца. Потым, вядома ж, пасябравалі. Зараз за нас таксама выступаюць тры чалавекі з «Мінскага мора», якіх мы да сябе запрасілі.

**— Выходзіць, да вашай каманды можа без праблем далучыцца любы гулец?**

— Не, трапіць да нас даволі-такі складана. Людзей мы запрашаем толькі на разавыя выступленні, калі, напрыклад, патрэбна спяваць альбо танцаваць. Навічку ў нашым калектыве будзе складна, бо ў нас завышаныя патрабаванні. Далучайцеся, калі ласка, але спачатку дакажыце, што вы можаце гуляць у КВЗ, прычым на якасным узроўні. Проста нам давялося шмат працаваць, каб заслужыць свой высокі статус. Але гэта не азначае, што мы перад усімі зачыняем дзверы і кажам: «Не, вы нам не падыходзіце!» Напрыклад, аднаго з удзельнікаў нашай каманды мы запрасілі з «Белых Росаў», бо палічылі, што ў нас яму будзе лепш і нам будзе з ім лепш. І менавіта ў нас ён раскрыўся.

**(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)**

*Зроблена ў Беларусі*

**Да 2015 года колькасць замежных грамадзян, якія атрымліваюць адукацыю ў Беларусі, павінна павялічыцца да 15 тысяч чалавек. Сёння ў нас навучаецца ўжо каля 14 тысяч замежнікаў з 88 краін свету. Такім чынам колькасць студэнтаў з іншых краін складае 2,5 працэнта ад агульнай колькасці студэнцкай моладзі. Сярод выпускнікоў беларускіх ВНУ з ліку замежных грамадзян ёсць міністры, дыпламаты, дырэктары ўстаноў адукацыі, кіраўнікі буйных прадпрыемстваў, галоўныя ўрачы медыцынскіх устаноў.**

# АДУКАЦЫЯ — НА ЭКСПАРТ

Сёння вострую канкурэнтную барацьбу за прыцягненне да сябе на вучобу замежных студэнтаў вядуць усе развітыя краіны свету, бо гэта таксама і барацьба за рынкі збыту сваёй прадукцыі, за набыццё надзейных сяброў. Дарэчы, у краінах, якія робяць стаўку на экспарт адукацыйных паслуг, доля замежных студэнтаў вагаецца ад 3 да 8 працэнтаў.

— Экспарт адукацыйных паслуг — гэта не толькі паступленне дадатковых сродкаў на цяперашнім этапе. Гэта яшчэ і імідж краіны, у тым ліку ў міжнародных адукацыйных рэйтынгавых сістэмах, і патэнцыял далейшых узаемаадносін Беларусі з іншымі дзяржавамі свету, — упэўнены **намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК.** — Адукацыя не можа быць шляхам у адзін бок. Выпускнікі ВНУ павінны вяртацца ў Беларусь у іншай якасці — як бізнесмены, дыпламаты, перакладчыкі — і быць праваднікамі эканамічных зносін паміж сваімі краінамі і Беларуссю. Сёння найбольшую колькасць замежных грамадзян, якія атрымліваюць адукацыю ў Беларусі, прадстаўляюць краіны СНД (63%). Затым ідуць краіны Азіі (29%), Афрыкі (5,8%), Еўропы (1,5%), Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі (0,4%). Асноўны экспарт адукацыйных паслуг прыпадае на Туркменістан, Кітай і Расію. Чацвёртае месца ў 2012 годзе заняла Нігерыя. Астатнія ж краіны прадстаўлены нешматлікімі групамі студэнтаў.

## «СВАЕ» ЛЮДЗІ Ў ДАЛЁКІМ ЗАМЕЖЖЫ

Для прыцягнення да навучання замежнікаў усе сродкі добрыя: рэклама праз сайт установы адукацыі (зразумела, на замежнай мове), распаўсюджванне інфармацыі праз пасольствы Беларусі за мяжой, удзел у міжнародных выставах... Некаторыя ВНУ робяць стаўку на прыцягненне новых студэнтаў з кола сваякоў і знаёмых сваіх студэнтаў-іншаземцаў. І ў тых ВНУ, дзе колькасць прадстаўнікоў замежжа даволі вялікая, гэтая тактыка і сапраўды забяспечвае больш-менш стабільны прыток слухачоў на падрыхтоўчыя аддзяленні.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)**

*З нагоды*

# УСЕ ЎЗРОСТЫ «МАЛАДОСЦІ»!

## ЧАМУ СУЧАСНЫ ЧАЛАВЕК ПАВІНЕН ЧЫТАЦЬ ЛІТАРАТУРНЫЯ ЧАСОПІСЫ

**Парадаксальна, але факт: часопісу «Маладосць» сёлета спаўняецца 60 гадоў. Як заставацца маладым, нягледзячы на ўзрост, як вытрымліваць канкурэнцыю з «Фэйсбукам» і чаму жанчын у літаратуры становіцца больш — пра гэта напярэдадні дня народзінаў выдання (святкуецца 23 красавіка) разважае Святлана ДЗЯНІСАВА, галоўны рэдактар штомесячнага літаратурна-мастацкага і грамадска-палітычнага ілюстраванага часопіса «Маладосць».**

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.



## ВЫТРЫВАЦЬ КАНКУРЭНЦЫЮ

**— Часопісу сёлета спаўняецца 60 гадоў, а называецца ён «Маладосць». Якім чынам можна гэта спалучыць?**

— Я вельмі шмат пра гэта думала апошнім часам, таму што даводзілася ў сувязі з юбілеем выдумляць рэкламныя слоганы і пісаць лісты якраз з такім дзіўным спалучэннем паняццяў. Я нават абуралася: калі 60 гадоў таму новаму часопісу зычылі доўгага жыцця, ці можна было называць яго словам, з-за якога паслядоўнікі сутыкнуцца з праблемамі такога кшталту?! А літаральна днямі на сустрэчы са студэнтамі Лінгвістычнага ўніверсітэта раптам убачыла, што гэтае спалучэнне ўсё ж магчымае. І выдатна, што магчымае! У каго як, а ў маім асабістым разуменні маладосць — з'ява вечная. І даць часопісу такую назву — вельмі мудрае рашэнне. Значыць, «Маладосці» прагназавалася вечнае існаванне! Хто аўтар назвы? Калі мы рыхтавалі юбілейную кнігу, я задавала гэтае пытанне многім. Але ніхто не адказаў. Увогуле, аўтарам ідэі стварэння часопіса быў Пётр Міронавіч Машэраў. Магчыма, і назва таксама сыходзіла ад яго. Пры тым, што гэты чалавек уже тады займаў высокую пасаду (узначальваў беларускі камсамол), ён не цураўся самых дробных арганізацыйных момантаў. Напрыклад, першага фатографа «Маладосці» — Аляксандра Сяргеевіча Дзітлава — запрасіў менавіта Машэраў. А калі Дзітлаў пацікавіўся, чаму менавіта ён, то дасціпны Машэраў адказаў: «А ты выгадны супрацоўнік — і пішаш, і фатаграфуеш, таму будзеш за дваіх працаваць». Дачка Дзітлава Вольга Аляксандраўна ў сваіх успамінах для кнігі ўдакладняе, што бацька быў яшчэ больш выгадным супрацоўнікам — ён меў уласны аўтамабіль і ўсе паездкі здзяйсняў на ім. Увогуле, шмат цікавага з гісторыі «Маладосці» апісана ў гэтай кнізе.

**— Ці ставіць часопіс мэту адкрываць новыя імёны? І ці магчыма гэта сёння рабіць наогул?**

— Ведаеце, у літаратурнага выдання заўсёды ёсць адначасова некалькі мэт. Прычым нічога новага ў спісе мэт сённяшняй «Маладосці» ў параўнанні з тымі, што былі на самым пачатку, няма. Мы павінны, па-першае, адкрываць новыя імёны. Па-другое, маладым чытачам, у тым ліку і гэтым новым імёнам, дэманстраваць узоры больш сталай і якаснай прозы і паэзіі. Гэта азначае, што «Маладосць» — выданне кшталту расійскай «Литературной учёбы», з якой мы, здаецца, неўзабаве пабратаемся. Між тым, у 1953 годзе часопіс хоць і ствараўся для моладзі, але гэта была не адзіная прычына яго стварэння. Увявіце сабе 1953 год. Пасля вайны ўжо адбудаваліся, пачалася новая хваля — стваральная праца на карысць душы. З вайны прыйшло пакаленне, якому было што сказаць, яны спарадзілі вялікую плынь мастацкіх твораў, пад якія не хапала пляцоўкі часопіса «Полымя», які тады ўжо існаваў.

**— А сёння, калі ёсць інтэрнэт, «ЖЖ», «Фэйсбук» ды і колькасць друкаваных літаратурных часопісаў у Беларусі таксама павялічылася, як «Маладосць» падтрымлівае аўтарытэт, каб пісьменнікі хацелі ў вас друкавацца?**

— Аўтарытэт менавіта тым і падтрымліваецца, што гэта друкаванае папяровае выданне, а не электроннае. У нашым грамадстве да гэтай пары чамусьці лічыцца, што па-сапраўднаму ты выходзіш у свет са сваім мастацкім творам толькі тады, калі цябе друкуюць на паперы літаратурнага часопіса, а не на яго сайце. Логікі тут я не назіраю, проста канстатую факт: ад людзей, якім раблю прапановы размясціць цікавыя матэрыялы менавіта на сайце, таму што папяровая версія не ўсё можа змясціць, чую нешта накшталт: «А я ж — разумееце? — хачу, каб гэта засталося».

**(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
18 04 2013 г.

# АДУКАЦЫЯ — НА ЭКСПАРТ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Другая стратэгія заключаецца ў прыцягненні замежных грамадзян на вучобу ў Беларусь праз фірмы-пасрэднікі. Большасць з гэтых фірмаў узначальваюць замежныя грамадзяне, якія навучаліся ў беларускіх ВНУ. Многія з іх атрымалі пасведчанне на правы жыхарства ў Беларусі, але актыўна падтрымліваюць кантакты з радзімай. Дзейнічае ў Беларусі і Міжнародная асацыяцыя выпускнікоў беларускіх ВНУ: адной з яе задач з'яўляецца падтрыманне пастаянных кантактаў з выхаванцамі беларускай школы.

— Пра Беларусь у свеце ведаюць яшчэ недастаткова. Затое ўсе добра ведаюць Расію і Кітай. Так вось мы звычайна «дапамагаем зарыентавацца»: тлумачым, што Расія — гэта краіна паміж Беларуссю і Кітаем, — жартуе **намеснік старшыні савета Міжнароднай асацыяцыі выпускнікоў Хасан ХАМУДА.**

## Прапусціць ці спыніць?

Вось толькі, на жаль, далёка не заўсёды ў рэалізацыі экспартнай палітыкі супадаюць інтарэсы ўсіх дзяржаўных ведамстваў. Прадстаўнікі органаў Міністэрства ўнутраных спраў і пагранічных службаў нярэдка з падазрэннем ставяцца да абітурыентаў з краін з так званай «павышанай міграцыйнай актыўнасцю»: ва ўмоўным «чорным спісе» знаходзяцца цэлы шэраг краін Азіі і Афрыкі. Пра гэта ішла гаворка падчас пасяджэння «круглага стала» на базе Беларускага дзяржаўнага радыётэхнічнага ўніверсітэта з удзелам членаў савета Міжнароднай асацыяцыі выпускнікоў. Замежныя грамадзяне прыязджаюць у Беларусь па запрашэннях ад устаноў адукацыі. Вось толькі на практыцы наяўнасць запрашэння зусім не гарантуе яе ўладальніку магчымасць застацца для навучання ў Беларусі... Тэрытарыяльныя падраздзяленні па грамадзянстве і міграцыі могуць адмовіць замежным грамадзянам ва ўездзе для навучання ў Беларусь.

— Я хачу, каб усе зразумелі, што Міністэрства ўнутраных спраў, як дзяржаўны орган, які забяспечвае нацыянальную бяспеку, адказвае ў першую чаргу за барацьбу з нелегальнай міграцыяй, — патлумачыў пазіцыю свайго ведамства **начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Рэспублікі Беларусь Аляксей БЯГУН.** — Большасць замежных студэнтаў беларускае заканадаўства не парушае і галоўная мэта іх знаходжання ў нашай краіне — атрыманне адукацыі. Але ў вялікім патоку замежных грамадзян ёсць і людзі з зусім іншымі мэтамі: гэта можа быць і прадпрымальніцкая дзейнасць, і ўдзел у нефармальных рэлігійных арганізацыях, і нелегальная міграцыя праз нашу тэрыторыю ў іншыя краіны.

**Многіх іншаземцаў, якія хацелі б атрымаць адукацыю ў беларускіх ВНУ, цікавіць, у першую чаргу, магчымасць атрымання ступені бакалаўра.**

Таму я выступаю за прыняцце дакладнай і празрыстай сістэмы правілаў, зразумелых для ўсіх: і для арганізацый-пасрэднікаў, і для ўстаноў вышэйшай адукацыі, і для супрацоўнікаў праваахоўнай сферы. Патрэбны абсалютна празрысты механізм узгаднення запрашэнняў. А пакуль кожны дзяржорган можа ўстанаўліваць свае правілы, якімі і будзе кіравацца: не выдаваць, не ўзгадняць і гэтак далей. Я лічу, што ўсе мы павінны быць зацікаўлены перш за ўсё не ў тым, каб як мага больш замежных студэнтаў прыехала ў нашу краіну, а ў тым, каб як мага большая колькасць замежнікаў атрымала адукацыю ў Беларусі. Установы адукацыі таксама павінны браць на сябе адказнасць за студэнтаў, якіх яны сюды прыцягваюць. Нядобрасумленныя пасрэднікі нам не патрэбны, а для новых і для ўжо правераных арганізацый-пасрэднікаў павінны быць устаноўлены адзіныя правілы. Але як сярод новых арганізацый-пасрэднікаў выявіць сумленных? Гэта магчыма будзе зрабіць толькі пасля першага года іх работы, прааналізаваўшы, колькі замежных студэнтаў па іх лініі прыехала ў нашу краіну, колькі з іх навучаецца, які іх рэйтынг, ці адпавядаюць іх дакументы аб адукацыі заяўленым.

## Даеш адукацыю па-англійску!

Найбольшая колькасць замежных студэнтаў навучаецца сёння ў БДУ — 2300 чалавек. Лідзіруючыя пазіцыі ў гэтым спісе займаюць студэнты з Кітая і Туркменістана, трэцяя пазіцыя — у расіян і толькі потым ідуць выхадцы з азіяцкіх і афрыканскіх краін. Колькасць замежных студэнтаў складае ў БДУ каля 12 працэнтаў ад агульнай колькасці студэнтаў, што з'яўляецца досыць высокім паказчыкам нават для замежных вышэйшых навучальных устаноў.

Пакуль БДУ робіць стаўку на рускамоўнае навучанне, паколькі цікавасць да рускай мовы ў свеце сёння досыць высокая: «Мы бачым вялікую цікавасць з боку краін «чацвёркі», асабліва Казахстана, дзе ёсць вялікая беларуская дыяспара», — адзначае **рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Сяргей АБЛАМЕЙКА.**

Але гэта зусім не азначае, што ў БДУ не разглядаюць перспектывы навучання студэнтаў на англійскай мове. Праўда, такі пераход патрабуе пэўнай падрыхтоўкі, у тым ліку прафесарска-выкладчыцкага складу. Пакуль было праведзена папярэдняе анкетаванне, якое паказала: шэраг педагогаў гатовы выкладаць на англійскай мове. І не выключана, што гэты патэнцыял будзе выкарыстаны ў будучыні. Пакуль жа падрыхтоўка на замежнай мове вядзецца ў БДУ толькі на другой ступені навучання.

## Дыстанцыйнае навучанне для іншаземцаў

А вось у Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі магчымасць атрымліваць адукацыю на англійскай мове з'явілася яшчэ ў 2009 годзе. Спачатку быў ажыццёўлены набор на першую ступень навучання, а ў 2010 годзе — зроблены набор іншаземных грамадзян і ў англамоўную магістратуру. Летась адбыўся першы выпуск.

— Для нас гэта быў вельмі адказны і нават рызыкоўны крок, да якога мы ішлі не адзін год, — прызнаецца **рэктар БДУІР Міхаіл БАТУРА.** — Вучэбны план змяшчае 56 дысцыплін, і па ўсіх іх мы павінны былі знайсці і падрыхтаваць калектывы выкладчыкаў, падрыхтаваць поўны камплект вучэбна-метадычнага суправаджэння адукацыйнага працэсу, прычым як на папяровых, так і на электронных носьбітах. Але сёння мы ўжо можам з задавальненнем канстатаваць, што наш досвед аказаўся паспяховым. Акрамя гэтага, мы выступілі з ініцыятывай аб стварэнні рэспубліканскай базы спецыялістаў, якія не проста добра валодаюць англійскай мовай, але і гатовы арганізоўваць на англійскай мове навучальны працэс. Не выключана, што такі ўзаемаабмен дазволіў бы далучыцца да арганізацыі выкладання на замежнай мове і іншым беларускім ВНУ.

Сёння ў БДУІР дзейнічаюць 32 навукова-вытворчыя лабараторыі, створаныя сумесна з рознымі кампаніямі, і, як правіла, у гэтых кампаніях на кіруючых пасадах працуюць выпускнікі БДУІР. Яны істотна дапамагаюць сваёй альма-матар ва ўдасканаленні лабараторнай базы. Так, зусім нядаўна ва ўніверсітэце быў адкрыты міжнародны вучэбна-навуковы цэнтр «Android Software Center». Садзейнічаў гэтаму выпускнік універсітэта Стыў Крэйнін, які зараз пражывае ў ЗША. І такіх прыкладаў шмат. Зараз кіраўніцтва ўніверсітэта вядзе перамовы са сваімі выпускнікамі аб арганізацыі падрыхтоўкі амерыканскіх грамадзян у БДУІР па дыстанцыйнай форме навучання...

**Мы павінны быць зацікаўлены перш за ўсё не ў тым, каб як мага больш замежных студэнтаў прыехала ў нашу краіну, а ў тым, каб як мага большая колькасць замежнікаў атрымала адукацыю ў Беларусі.**

Па словах **першага прарэктара БДУІР Анатоля ОСІПАВА,** кожны трэці магістрант і кожны пяты аспірант універсітэта — гэта замежны грамадзянін: «Яны прыбываюць на вучобу па накіраванні дзяржаўных арганізацый, а таксама арганізацый-пасрэднікаў. І трэба сказаць, што замежныя грамадзяне, якія ў нас вучацца, вельмі матываваныя да вучобы. Гэта пацвярджае той факт, што 40% выпускнікоў 2012 года атрымалі дыпломы з адзнакай.

## Спецыяліст бакалаўру не сябра?

Адной з сур'ёзных перашкод для нарошчвання экспарту адукацыйных паслуг (і гэта канстатуюць усе кіраўнікі ВНУ) застаецца недахоп у інтэрнатах месцаў для размяшчэння замежных студэнтаў. Яшчэ адна праблема — кваліфікацыя, якія прысвойваюцца выпускнікам беларускіх ВНУ, не заўсёды зразумелыя ў іншых краінах. У прыватнасці, у Беларусі ад ступені бакалаўра было вырашана адмовіцца. Першая ступень у нас — гэта ступень спецыяліста. А многіх іншаземцаў, якія хацелі б атрымаць адукацыю ў беларускіх ВНУ, цікавіць, у першую чаргу, магчымасць атрымання ступені бакалаўра, якая з'яўляецца абавязковай умовай іх працаўладкавання на радзіме.

Намеснік міністра адукацыі Віктар Якжык лічыць вельмі перспектыўным накірункам адкрыццё за мяжой філіялаў беларускіх ВНУ: філіялаў факультэтаў, падрыхтоўчых аддзяленняў, прадстаўніцтваў і цэнтраў. Пакуль дзейнічаюць толькі два філіялы беларускіх універсітэтаў за мяжой — Ерэванскі філіял МДЭУ імя акадэміка А.Д. Сахарава і сумесны Інжынерна-тэхнічны факультэт Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта і Таджыкскага тэхнічнага ўніверсітэта імя акадэміка М.С. Асімі. Праўда, ужо ёсць рамачныя дамоўленасці аб адкрыцці беларускіх адукацыйных структур і ў іншых краінах. Яны будуць скіраваны на падрыхтоўку не толькі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, але і кіраўнікоў сярэдняга звяна, а таксама на падрыхтоўку рабочых кадраў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.



### Будзь у курсе:

*З 2012 года ў грамадзян краін ЕўрАзЭС (Расіі, Казахстана, Кыргызстана і Таджыкістана) з'явілася дадатковая магчымасць — паступаць у беларускія вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы на платную форму навучання як іншаземцам — па выніках гутаркі. Нагадаем, што раней гэтая катэгорыя абітурыентаў залічвалася і на бюджэтную, і на платную форму навучання толькі на конкурснай аснове па выніках здачы цэнтралізаванага тэсціравання. Тэрміны паступлення для замежных грамадзян вызначаны да 15 кастрычніка.*

Самыя-самыя

# «ІТ-ПЛАНЕТА» ВЫЗНАЧЫЛА ЛЕПШЫХ

**У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі адбыўся фінал нацыянальнага этапу міжнароднай студэнцкай алімпіяды «ІТ-Планета». Удзел у ім прынялі 55 студэнтаў з 12 вышэйшых навучальных устаноў.**

Міжнародная алімпіяда «ІТ-Планета» праводзіцца з 2007 года. Сёлета ў ёй удзельнічалі студэнты з Расіі, Украіны, Беларусі, Казахстана і Узбекістана. Нацыянальны адборачны этап алімпіяды праводзіўся ўпершыню. Нягледзячы на гэта, беларускія студэнты аказаліся надзвычай актыўнымі: праз адборачныя туры прайшлі 335 прадстаўнікоў з 18 устаноў адукацыі. А ўвогуле, алімпіяда сёлета прыцягнула больш як 11 тысяч студэнтаў з краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

— Летась студэнты БДУІРа ўзялі ўдзел у міжнародным фінале алімпіяды, які праходзіў у Алматы (Казахстан), і паказалі там дастаткова высокія вынікі, — паведаміў **намеснік старшыні беларускага аргкамітэта, намеснік дэкана факультэта камп'ютарных сістэм і сетак БДУІР Аляксей ЛЯШЧОЎ.** — Пасля гэтага міжнародны камітэт алімпіяды звярнуўся да нашага ўніверсітэта з прапановай правесці нацыянальны адборачны этап.

У беларускім фінале 55 лепшых удзельнікаў адборачных тураў вочна змагаліся за адно з трох месцаў у пяці намінацыях.

— «ІТ-Планета» — гэта практыка-арыентаваная алімпіяда, — падкрэслівае Аляксей Ляшчоў. — Адна з яе асаблівасцяў заключаецца ў тым, што заданні для спаборніцтваў рыхтавалі спецыялісты вядучых сусветных кампаній у распрацоўцы інфармацыйных сістэм. Нам вельмі прыемна, што шэраг беларускіх кампаній, якія ўваходзяць у Парк высокіх тэхналогій, не проста зацікавіліся гэтай алімпіядай, але і падтрымалі яе. Таксама прадстаўнікі ІТ-кампаній прысутнічалі на алімпіядзе ў якасці членаў журы.

Найбольш паспяхова ў фінале нацыянальнага этапу алімпіяды выступілі студэнты Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны (у міжнародны фінал прабіліся адразу чацвёра ўдзельнікаў) і Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта, што сведчыць пра добрую якасць падрыхтоўкі будучых праграмістаў у рэгіянальных ВНУ.

Аляксей Жвірбліс, магістрант БДУІР, не навічок на «ІТ-Планеце». Але на гэты раз яму давялося прайсці праз «сіта» нацыянальнага адбору.

— Каб перамагчы і прабіцца далей, давялося прыкласці шмат намаганняў, — прызнаецца Аляксей. — Праўда, рыхтавацца я пачаў адразу пасля леташняй паездкі ў Казахстан на міжнародны этап алімпіяды. Таму, напэўна, мне было крыху прасцей, чым іншым.

У чэрвені пераможцы нацыянальнага этапу алімпіяды прадставяць нашу краіну на міжнародным фінале ў Кіеве. Акрамя студэнтаў з Гомельскага дзяржаўнага і Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэтаў у фінале будуць выступаць студэнты БДУІР, Гродзенскага, Віцебскага і Полацкага дзяржаўных універсітэтаў, Беларуска-Расійскага ўніверсітэта, БДУ, Гомельскага тэхнічнага ўніверсітэта і Вышэйшага каледжа сувязі. Такім чынам, у фінале будуць змагацца студэнты 10 беларускіх ВНУ.

Для ўсіх пераможцаў алімпіяды ўдзел у спаборніцтвах — гэта выдатны шанц не проста рэалізаваць свае навыкі і веды на практыцы, але і наладзіць стасункі з высакакласнымі спецыялістамі, а таксама працаўладкавацца ў вядучыя ІТ-кампаніі, якія займаюцца распрацоўкай праграмнага забеспячэння.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
18 04 2013 г.

# «КВЗ ЗБІРАЕ ЎСЁ, ШТО Ў ЦЯБЕ ЁСЦЬ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— А якая «іскрынка» ў каманды БДУ?***

— Мы пазіцыяніруем сябе як каманда вельмі назіральных. Напрыклад, заўважаем людзей, якія, калі чысцяць бульбу, робяць самую доўгую палоску. І намагаемся жартаваць у гэтым кірунку.

***— Звычайна за членам каманды замацавана пэўнае амплуа. Ці назіраецца падобная тэндэнцыя ў вас?***

— Канкрэтных вобразаў у гульцоў няма. Ёсць людзі, якія больш вылучаюцца акцёрскімі здольнасцямі. Ёсць тыя, хто заўжды выконвае ролі «алкашоў-бамжоў» і ў іх гэта здорава і смешна атрымліваецца.

***— А што галоўнае: набраць артыстычных і харызматычных гульцоў з запамінальнымі тварамі, або людзей з выдатным пачуццём гумару, гатовых самастойна прыдумляць жарты?***

— Галоўнае, каб усё было гарманічна. Ёсць такая прымаўка: «У КВЗ могуць гуляць усе». У гэтым і праблема зараз. Як паказвае практыка, пераможцамі ў КВЗ становяцца так званыя «фрыкі». Гэта людзі з пэўнымі дэфектамі ў знешнасці ці маўленні, але яны смешныя. Таму адсюль можна зрабіць вынік: калі хочаш перамагаць у КВЗ, проста будзь смешным! І зусім не важна, што ў цябе будзе пераважаць — харызматычнасць ці пачуццё гумару.

***— Хто рыхтуе сцэнарый выступлення? І колькі часу звычайна на гэта ідзе?***

— Усё прыдумваем самі. Спачатку маглі на гэта траціць месяц, апошнім часам можам напісаць і за тыдзень. Зараз ужо з'явіўся пэўны досвед: мы разумеем, што патрэбна гледачам. І вельмі радуе, што часта нашы густы з аўдыторыяй супадаюць!

***— Ці згодны вы, што нярэдка менавіта конкурс «Размінка», дзе патрабуецца ўменне ўдала і хутка жартаваць, становіцца вызначальным пры расстаноўцы сіл у гульні?***

— Раней, калі былі вялікія каманды, то «Размінка» і сапраўды была вырашальным конкурсам. Зараз у «вялікім» КВЗ яна адыходзіць на другі план. Справа ў тым, што ў сучасным КВЗ існуе такая тэндэнцыя — мецэнат спонсара. У такіх камандах гульцы выконваюць ролю наёмных працоўных. Спонсар укладае грошы, а каманда павінна гуляць. Але акцёры — не заўжды людзі з выдатным пачуццём гумару, якія могуць на « Размінцы» хутка сцяміць і ўдала выкінуць жарт.

***— Вы хочаце сказаць, што ў сучасным КВЗ шмат чаго вырашаюць грошы?***

— На вялікі жаль, гэта так. Калі ў каманды ёсць грошы, яна найме «правільных людзей» і тыя накіруюць каманду ў патрэбнае рэчышча. Мабыць, каманда не стане пераможцам, але запомніцца гледачам і суддзям. Гэта — каманды-праекты. Не, вядома, там ёсць таленавітыя людзі. Але асноўныя пераможцы Вышэйшай Лігі — каманды з грашыма.

***— А хто спансіруе вашу каманду?***

— Нас спансіруе БДУ. Вядома, і самім даводзіцца ўкладаць шмат грошай. Але БДУ нам вельмі дапамагае. Напрыклад, часта прыходзіцца звяртацца па рэквізіт. І добра, што БДУ не абмяжоўвае ў творчасці.

***— Чым адрозніваецца тэлеверсія ад «жывой» гульні?***

— Па-першае, любая тэлеверсія гульні — гэта пэўны фармат па часе, таму там шмат чаго выразаецца. Па-другое, самае галоўнае, — у тэлеверсіі глядач не адчувае энергетыкі ад каманд. А ў зале ты заўжды адчуваеш каманду. Па тэлебачанні ўсё па-іншаму. Але і тут ёсць свае асаблівасці. Напрыклад, беларускі КВЗ ( Першую лігу, Лігу БДУ) трэба глядзець ужывую. А вось Вышэйшую лігу трэба глядзець па тэлевізары. Там могуць правільна выбраць ракурс здымкі і якасна накласці смех.

***— Як вы перажылі не вельмі ўдалае выступленне ў 1/8 фіналу Вышэйшай лігі сёлета?***

— Нармальна. Вядома, было крыўдна, бо мы хацелі прайсці далей і спадзяваліся, што ў нас гэта атрымаецца... Нават сталі рыхтаваць сцэнарый ужо да 1/4 фіналу. Але, напэўна, не прыйшоў яшчэ наш час. Мы хацелі трапіць у Вышэйшую лігу — мы ў яе трапілі. І, аналізуючы нашы промахі зараз, разумеем, што былі трохі самаўпэўненымі... Можна было выступіць лепш. Што казаць, прайгралі самі сабе. І нельга ў гэтым кагосьці абвінавачваць.

***— А калі павярнуць час назад, што б вы змянілі?***

— Напэўна, больш звярнулі б увагі на арганізацыйную працу, бо яна была кепская. Можна прывесці прыклад — банальныя праблемы з рэквізітам. Не ўсё было падрыхтавана. Мы спалі па дзве гадзіны ў суткі, і аб ясной галаве на рэпетыцыях не магло ісці і гаворкі. Таму атрымалася не зусім тое, што планавалася.

***— Ці збіраецеся вы сёлета на «Юрмалу»?***

— Шчыра кажучы, наўрад ці. Пакуль няма запрашэння. Калі паступіць, будзем думаць. Вядома ж, было б здорава! Людзі ўзгадалі б, што ёсць такая каманда і было б прасцей трапіць зноў у Вышэйшую лігу.

***— А як вы ацэньваеце састаў сёлетняй Вышэйшай лігі? У каго больш шанцаў на перамогу?***

— Я ўжо казаў, што ў сучасным КВЗ шмат чаго прадвырашана. Існуе такі падзел: ёсць сапраўды смешныя каманды, а ёсць каманды, якія, як той казаў, «заслужылі». У пэўны час «смешныя» каманды пераходзяць у разрад «заслужаных». У гэтым годзе стане чэмпіёнам каманда Пяцігорска — гэта амаль дакладна. Іх вядуць да перамогі. Але гэта не азначае, што яны не смешныя. Яны якраз, напэўна, самыя смешныя. Яшчэ б я вылучыў каманды «Парапапарам», «Саюз». Увогуле, зараз пайшла такая «мода»: гуляеш у Вышэйшай лізе некалькі гадоў, сыходзіш, вяртаешся праз сезон і ты — пераможца!

***— Калі разумееце такое становішча, рукі не апускаюцца?***

— Пакуль не. Проста няма канкрэтных гумарыстычных праектаў, якімі можна было б жыць. Пакуль жа мы вучымся, працуем і гуляем у вольны час, не ставячы КВЗ на першы план у жыцці.

***— Ці ёсць у каманды куміры ў КВЗ?***

— Думаю, не. Ёсць каманды, якія падабаюцца, ёсць акцёры, за якімі хочацца цягнуцца. Нам, напрыклад, падабаецца каманда «Фёдар Двініяцін» і з некаторымі яе ўдзельнікамі мы ў добрых стасунках. Ёсць каманды, якія падабаюцца, але мы ведаем іх асабіста і разумеем, што яны так сабе як людзі.

***— А ці падтрымліваеце сувязь з папярэднікамі з каманды БДУ?***

— У асноўным яны амаль усе паз'язджалі... Але з тымі, хто застаўся ў Мінску, — безумоўна! У нас добрыя стасункі з Аляксандрам Гаўрыльчыкам — вядучым нашай лігі. Аляксандр — самы блізкі чалавек для нашай каманды, ён заўжды дае нам слушныя парады. Але каб мы рабілі з кімсьці агульныя праекты, — такога няма.

***— А як вы ставіцеся да таго, што расіяне «пераманьваюць» нашых лепшых гульцоў да сябе?***

— Абсалютна нармальна. Калі ты малады, перспектыўны і таленавіты гулец, то табе хочацца ісці далей. А ў Расіі, натуральна, больш шанцаў для самарэалізацыі. Я сам думаў пра такі варыянт у свой час. Але пакуль гэта амаль нерэальна.

***— Як вы лічыце, дзеля чаго варта гуляць у КВЗ?***

— У кожнага свае мэты. Мне, напрыклад, падабаецца сцэна, падабаецца гуляць. Але, натуральна, што для кожнага з нас гэта не проста гульня, а лад жыцця. Мы сыходзім са сцэны і застаёмся такімі ж вострымі на язык і вясёлымі. КВЗ прымушае пастаянна пашыраць кругагляд. Каб гуляць у КВЗ, трэба быць начытаным. Усе гульцы — людзі развітыя. Адзінае, крыўдна, што прыходзіць шмат таленавітых людзей, але іх зацягваюць тусоўкі. Вядома, так ва многа весялей, чым сядзець і працаваць. Проста трэба не забываць пра тое, што ты аддаеш КВЗ усё, што ў цябе ёсць, — сілу, душу, грошы. Ён жа табе дорыць толькі апладысменты (*смяецца*). Таму, прыйшоўшы сюды, трэба выкладвацца на ўсе сто, не чакаючы аддачы. Толькі ў гэтым выпадку прыйдзе поспех і задавальненне ад таго, чым ты займаешся.

**Вікторыя ЧАПЛЕВА.**



**«ВЯСЁЛЫЯ І ЗНАХОДЛІВЫЯ» ЖАРТУЮЦЬ:**

- ✓«Пасля фразы «Не на карову ж гуляем» усе выразна пачулі радасны выдых з хлява...»
- ✓ *«Інжынер, які доўга не мог намаляваць план эвакуацыі, у выніку падпаліў будынак і пачаў глядзець, адкуль палезуць людзі»*
- ✓ «Мужыкі каля крамы і так збіраліся піць, а тут яшчэ хтосьці пра народзіны Уолта Дыснея ўзгадаў».
- ✓ *«Мала хто ведае, што забойца Пушкіна і забойца Лермантава потым страляліся на дуэлі за Суперкубак»*
- ✓— Як спалучыць прыемнае з карысным?
— Навучыць путану варыць боршч.
- ✓ *Каця пачала штосьці падазраваць, калі пасля сексу яе хлопец адвярнуўся да сцяны і сказаў: «А вам слабо?»*

---

**Новы стары знаёмы**

## Андрусь ТАКІНДАНГ:

# «ВАЖНА ЗАФІКСАВАЦЬ У СЭРЦЫ МОМАНТ, КАЛІ ЎСЁ ЦУДОЎНА»



**Беларускі мастак, музыкант, паэт. Удзельнік гуртоў фолькмадэрнавай музыкі «Рэха» і «ска-джаз-рэгі-панк» «Гаротніца». Так Андруся апісвае Вікіпедыя. У спадара Такінданга даволі часта бяруць інтэрв'ю, і ўжо цяжка «адкрыць» у яго асобе нешта новае. І ўсё ж...**

***— З кім з гістарычных асоб, знакамітых людзей вы хацелі б сустрэцца, каб была такая магчымасць?***

— Выдатна было б зладзіць гастролі з Караткевічам. З Генадзем Бураўкіным была такая супольная паездка ў Калінінград. Быў канцэрт, пасля паэтычнае выступленне Генадзя Мікалаевіча, застольная размова. Таксама і з Караткевічам было б цікава зладзіць нешта такое, бо гэта людзі аднаго пакалення і кірунку.

***— Вашы першыя самыя яскравыя жыццёвыя ўражанні?***

— Я памятаю, як мяне здзівіла тое, што людзі паміраюць. Калі ты маленькі і даведваешся пра існаванне смерці, што з цягам часу памруць бабуля, дзядуля, бацькі і ты сам калі-небудзь памрэш...

***— Вы больш любіце святы ці будныя дні?***

— Люблю і святы, і будныя дні (*смяецца*). Насамрэч важна злавіць такую хвалю, такі прамежак часу, калі праблем няма, калі і ў душы, і звонку добра. Я заўсёды стараюся зрабіць нібы ўнутраны фотаздымак, зафіксаваць у сэрцы гэты момант, калі ўсё цудоўна: ты ідзеш, у цябе рукі-ногі не баляць, сваякі здаровыя, на душы добра і мозг нічога не выядае. А святы — гэта цудоўная нагода для свят (*смяецца*). А калі казаць пра працу як пра штодзённасць, то ў мяне ўласны графік, дзе фіксаваных адпачынкаў няма. Да таго ж праца творчая, якая больш падобная да свята: ці то канцэрт, дзе ты маеш магчымасць рэалізаваць сябе, ці то рэпетыцыя, дзе ты ствараеш штосьці новае.

***— Якая кніга ў вас засталася недачытанай і чаму?***

— Кніга, якая адразу ўзгадваецца, — гэта аповесць Элізы Ажэшкі «Хам». Я яе не дачытаў, бо прадчуваў трагічную развязку. Сюжэт так заваструўся, што я вырашыў адкласці яе ўбок.

***— З папярэдніх інтэрв'ю я даведалася, што ваша любімая кніга — «Людзі на балоце». Чым яна так уразіла?***

— Кніга пераканаўчая, я ёй веру. Праўда, цяжка было яе дачытваць, бо яна вельмі ўзрушыла. Мележ робіць так, што атмасфера, якую ён апісвае, становіцца датыкальнай. Вёска, каханне, праца, жарсці вакол зямлі, праблема ўзаемаадносін — усё гэта мне знаёма і блізка.

***— Наколькі вам цікавы беларускі фальклор?***

— У пэўны перыяд часу я слухаў запісы аўтэнтычнай музыкі. Таксама «Троіцу» і «Вырай», якія працуюць з народным матэрыялам і робяць яго сучасным. І гэта натхняе. Не магу сказаць, што я працую з фальклорам, з народнай музыкай, але адчуваю іх магію...

***— Як нараджаюцца тэмы вашых твораў?***

— Іх падказваюць людзі, іх твары, вочы, характары. Усё гэта падштурхоўвае да радкоў, якія калісьці стануць спевамі. Нават магу падзяліць творчасць на пэўныя перыяды, калі крыніцай натхнення была нейкая асоба, якой прысвячаліся ўсе творы.

***— Чым абумоўлена разнастайнасць вашай творчасці?***

— Цікава выкарыстоўваць розныя літаратурна-музычныя кірункі, іншымі словамі, не толькі рок альбо шансон. Раней па маладосці было вельмі адназначнае стаўленне да музыкі: гэта вось мой кірунак, а гэта — не, і тыя, што слухаюць рэп альбо папсу, ужо нічога не вартыя, а панк-рок — толькі наперад... І калі такое вострае стаўленне знікае, разумееш, што гэта толькі музыка, і ты ўжо не лічыш за ганьбу выкарыстоўваць тыя кірункі, да якіх раней ставіўся з пагардай.

***— Кожны чацвер у межах праграмы «Наша утро» на АНТ выходзіць перадача з вашым удзелам, у якой расказваецца пра паходжанне беларускіх слоў. Ці дапамагае беларусам вывучаць беларускую мову...***

— Гэта нельга назваць вывучэннем. Хутчэй, мы разглядаем словы, даведваемся пра іх паходжанне. Інакш кажучы, гэта не паглыбленае вывучэнне, а паліцэйскі... 

***— Хто дапамагае ў падборы матэрыялу?***

— Я шукаю словы, а Алена Анісім, якая з'яўляецца супрацоўнікам Акадэміі навук, падводзіць пад іх этымалагічную базу. Я перапрацоўваю тое, што яна сказала, і падаю гледачам.

**Кацярына ПАРЫЖЭСКАЯ, Ліцэй БДУ.**

Конкурс «Новы погляд»

# ШУКАЕМ ТАЛЕНТЫ!

**Ты малады, энергічны, крэатыўны? Ты размаўляеш на роднай мове і табе карціць паспрабаваць свае сілы? Тады «Чырвонка» запрашае ўсіх ахвотных узяць удзел у конкурсе пад назвай «Новы погляд»!**

Сутнасць конкурсу — у яго назве. «Чырвонка» прапануе нашым юным і маладым карэспандэнтам зірнуць на жыццё па-іншаму. Убачыць нешта новае ў, здавалася б, будзённым. Або адшукаць тое, чаго да вас яшчэ нікому не ўдавалася. Складана? Даём падказку: бярыце тэмы з жыцця моладзі, якое віруе вакол вас. Паверце, яно непаўторнае! Што вас найбольш цікавіць, хвалюе? Не «ліце ваду», не разважайце, а пішыце пра канкрэтныя сітуацыі, пра сваіх равеснікаў. Спрачайцеся, даказвайце свой пункт гледжання, але — аргументавана!

Жанр вашых допісаў можа быць любым: нататкі, інтэрв'ю, рэпартаж. Галоўнае, каб было цікава напісана. Гэта найпершы крытэрый, якога мы папрасілі б прытрымлівацца. Лепшыя з дасланых матэрыялаў будуць надрукаваны ў «Чырвонцы».

Нагадаем таксама, што па выніках конкурсу трох пераможцаў чакаюць прызы. Зрэшты, думаецца, тых, хто прайграе, не будзе: для ўсіх, хто збіраецца паступаць на факультэт журналістыкі, удзел у «Новым поглядзе» стане, спадзяёмся, добрай школай юнага карэспандэнта. Спяшайцеся, конкурс доўжыцца да 1 мая (дата адпраўкі матэрыялаў). Свае творчыя працы дасылайце на электронны адрас рэдакцыі: zvarot@zvyazda.minsk.by (з абавязковай пазнакай — на конкурс «Новы погляд») або ў пісьмовым выглядзе на адрас «Звязды».

І яшчэ. Абавязкова напішыце пра сябе: узрост, месца працы ці вучобы, колькі слоў пра свае захапленні, мары, памкненні. Укажыце кантактныя нумары тэлефонаў, па якіх з вамі можна будзе звязацца, і ў які час. Для налічэння ганарару, калі матэрыял будзе надрукаваны, укажыце свой паштовы адрас (з індэксам), пашпартныя звесткі (кім і калі выдадзены, нумар, асабісты нумар (доўгі радок з лічбаў і літар), сваё імя, імя па бацьку, прозвішча. Уся гэтая інфармацыя павінна быць на рускай і беларускай мовах.

БЕЛАРУСЬ — МАЯ РАДЗІМА

# «МНЕ ПАШЧАСЦІЛА НАРАДЗІЦЦА МЕНАВІТА ТУТ...»

Белая Русь — менавіта так здаўна завуць нашу Радзіму. Гэтае паэтычнае імя найлепш падыходзіць гэтай краіне. Белая — значыць чыстая, светлая. Нашай прыродзе не ўласцівы яркія фарбы Міжземнамор'я ці экзатычнасць Афрыкі. Яе характэр у далікатных пераліваx ранішняга неба, прасторных палях, чароўных і таямнічых лясах. Спыніцеся, нацешцеся гэтай прыгажосцю, зазірніце ў блакітныя вочы Беларусі — яе шматлікія азёры.

Здаецца, што тут час замарудзіў свой бег. Бо вакол некранутая чалавекам прырода, хоць мы знаходзімся ў самым цэнтры Еўропы. Ну і няхай вакол бурліць XXI стагоддзе, няхай цывілізацыя прасоўваецца наперад сямімільнымі крокамі, а ў Беларусі прырода застаецца натуральнай, людзі — чалавечнымі, а каштоўнасці — вечнымі.

За сваю шматвяковую гісторыю Беларусь была заваявана не раз, але сама ніколі не была заваёўніцай. Беларусам даводзілася змяняць веру, прымаць іншую культуру і мову. Але пры ўсім гэтым краіна ніколі не губляла сваёй самабытнасці. Яна схілялася, як трава пад ураганам, каб пасля зноў распрастацца і зазелянець.

За што я люблю сваю Беларусь? Мабыць, за яе дзівосныя пейзажы, культуру, але галоўны здабытак — гэта яе народ.

Жыхары Беларусі вызначаюцца сваёй талерантнасцю, дабрынёй, гасціннасцю і здольнасцю з разуменнем ставіцца да чужой культуры. Магчыма, мы здаёмся занадта наіўнымі і даверлівымі. Але мы такія, і мы ганарымся сабой і сваёй роднай Беларуссю. Беларусам заўсёды нялёгка ўдалечыні ад Радзімы. Гэта не таму, што нам цяжка знайсці агульную мову з іншымі народамі. Не, мы ўмеем ладзіць і сябраваць. Проста нам цяжка нават ненадоўга растацца з роднымі краямі.

Таму гэтым летам я вырашыла лепей спазнаць абшары сваёй Радзімы. Разам з бацькамі мы цэлы тыдзень падарожнічалі па краіне. І ведаеце: нішто, ніякія марскія курорты не параўнаюцца з начным купаннем і начлегамі ў палатцы. А яшчэ аказалася, што ў нас сапраўды ёсць на што паглядзець!..

Беларусь — гэта краіна замкаў. Раней іх было 116, але, на жаль, захаваўся толькі 21. Самыя вядомыя з іх — гэта замкі ў Міры і Нясвіжы. Іх сапраўды варта наведаць. Заходзячы ў такія старадаўнія будынкі, адразу адчуваеш іх моц і сілу.

Але не толькі замкамі багатая наша Радзіма. Гэтак жа мы ганарымся Белавежскай пушчай, Брэсцкай крэпасцю, Бярэзінскім запаведнікам, шматлікімі саборамі. Раю наведаць комплекс «Хатынь», Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту «Дудуткі»... Няма сэнсу пералічваць усе архітэктурныя помнікі, музеі і запаведнікі Беларусі. Наша краіна сапраўды вартая таго, каб пра яе ведалі, ёю ганарыліся і захапляліся.

Мне пашчасціла нарадзіцца менавіта тут. Я люблю сваю Радзіму, схіляюся перад яе мінулым і веру ў яе светлую будучыню. Мне заўсёды прыемна вяртацца дахаты пасля нейкай працяглай вандроўкі, бачыць ветлыя твары суайчыннікаў, адчуваць прамяні цёплага сонца і разумець — я на сваім месцы, і мяне тут чакаюць... Мне не патрэбна чужая краіна, таму што мая Радзіма — Беларусь.

**Арына КАГАЛЁНАК, фота аўтара.**



### Пра аўтара

*Арыне 15 гадоў, яна вучыцца ў 9 класе наваполацкай гімназіі №2. Пісаць «як журналіст» пачала з мінулага года, можна сказаць, выпадкова: напачатку пайшла ў гурток «Залатое пяро» проста за кампанію з сяброўкай і дзеля новых знаёмстваў, але пасля першай надрукаванай работы зразумела, што захапілася «ўсур'ёз і надоўга». Сама Арына лічыць, што лепш за ўсё ў яе атрымліваюцца артыкулы і рэпартажы.*

*Дзяўчына таксама займаецца ў гуртку юных выратавальнікаў-пажарных, захапляецца майстраваннем і спортам, любіць падарожнічаць, фатаграфаваць, маляваць, слухаць розную музыку і чытаць. Любімыя аўтары — Булгакаў, Гофман, Чэхаў, Гюго, О. Генры, Купала.*

*— Для мяне галоўная мэта на найбліжэйшую будучыню — паспяховa здаць іспыт, — гаворыць сама Арына. — А галоўнае жаданне — каб было паболей творчага натхнення і творчых поспехаў.*

# УСЕ ЎЗРОСТЫ «МАЛАДОСЦІ»!




Так выглядае часопіс сёння.

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

Людзі самі не ўспрымаюць змешчанае ў інтэрнэце як тое, што захаваецца для нашчадкаў. І гэтым пакуль яшчэ можна карыстацца. А далей... Зноў, спадзяюся, рашэнне падкажа само жыццё.

**— Калі зрабіць «камбэк» у мінулае, каго адкрыла «Маладосць» з тых, хто цяпер ужо, можа быць, класік? І якімі маладымі прозвішчамі часопіс можа пахваліцца сёння?**

— Рызыкоўная гэта штука — заяўляць пра тое, што літаратурны часопіс можа некага адкрыць. Ці можна сцвярджаць, што «Маладосць» адкрыла Караткевіча, калі ён у ёй — амаль толькі ў ёй — і друкаваўся? Напэўна ж, Караткевіч стварыў бы свае шэдэўры і без «Маладосці». Не трэба падманвацца: таленавіты чалавек адкрые сябе сам. Справа часопіса толькі ў тым, каб гэта адбылося хутчэй. Мы можам толькі паспрыяць раскрыццю, але не адкрыць. Да таго ж пры накладзе ў 2,5 тысячы экзэмпляраў цяжка пахваліцца тым, што мы некага «адкрылі»: гэтага «некага» ўсё роўна прачытае толькі вузкае кола асабліва зацікаўленых. Але пахваліцца новымі імёнамі часопіс можа. Вельмі прыемным адкрыццём стала імя Сяргея Маціна. Узрадавала і рэдактараў, і чытачоў імя Уладзіміра Мажылоўскага. Хоць па ўзросце яго нельга залічыць да моладзі, але аповесць «Праклён мітрапаліта Фіяфіла» чытачамі ўжо адзначана. Былі нават тэлефанаванні з пытаннем, ці будзе працяг. Адказваю ўсім: сёлета мы надрукуем яшчэ адзін твор Уладзіміра Мажылоўскага. Акрамя гэтага, у Выдавецкім доме «Звязда» рыхтуецца да выхаду яго раман пад рабочай назвай «Нашэсце». Падзеі ў ім звязаны з падзеямі аповесці «Праклён мітрапаліта Феафіла».

### ГУЛЬНЯ Ў ЧАСОПІС

**— Два вашы папярэднікі — галоўныя рэдактары — таксама былі жанчынамі...**

— Так, тры апошнія — жанчыны, сем першых — мужчыны...

**— Ці сведчыць гэта пра нейкую тэндэнцыю ажаночвання беларускай літаратуры ці менеджараў у літаратуры? Або гэта проста выпадковасць?**

— Гэта ні ў якім разе, вядома ж, не азначае, што ў беларускай літаратуры стала больш жанчын або жаночая творчасць узнялася над мужчынскай... Паміж полам галоўнага рэдактара літаратурнага выдання і тымі гендарнымі шалямі, якія ўвогуле існуюць у літаратуры, ніякай залежнасці няма. Тут залежнасць іншая — ад часу. Калі параўноўваць сённяшнюю «Маладосць» з мінулай, няцяжка заўважыць, што раней — прынамсі, да майго прыходу — гэта было выданне, якім у абавязковым парадку кіраваў менавіта пісьменнік, і пісьменнік з імем. І намеснік галоўнага рэдактара, і рэдактары аддзелаў, і адказны сакратар — усе яны былі пісьменнікамі. Сёння ж, каб неяк вытрымліваць канкурэнцыю з выданнямі для адпачынку, «глянцавай» прэсай і інтэрнэтам, літаратурныя часопісы павінны мець новыя, некласічныя імідж і напаўненне. Яны павінны гэтаксама хутка прыстасоўвацца да асяроддзя, як і астатнія. А для вырашэння гэтай задачы ўвесь час патрэбна нейкая гульня. Пісьменніку гуляць у часопіс складана — хаця б таму, што гэта адбірае шмат часу, які яму лепш было б патраціць на ўласную творчасць. Новы кіраўнік павінен быць менеджарам і ведаць рынак друкаваных СМІ. Таму што мы павінны вырашаць звышзадачу: неяк прыцягваць тых, хто ніколі не звяртаўся да чытання літаратурных выданняў. Мы павінны зрабіць нешта такое, каб далёкі ад літаратуры чалавек падумаў: а што, калі я зазірну пад вокладку гэтага выдання? Што, калі куплю сёння не кніжку, а літаратурны часопіс? Я разумею, што чытацкае кола літаратурных часопісаў вельмі вузкае. Але я хачу, каб гэтае кола складалі не толькі тыя, хто марыць быць пісьменнікамі, але і тыя, хто мае адукацыю тэхнічную, матэматычную — якую заўгодна, а можа, нават, і ніякай не мае, але лічыць сябе сучасным чалавекам. Я хачу, каб літаратурныя часопісы чыталіся сучаснымі людзьмі. Тыя, хто да іх ужо не звяртаецца, як і тыя, хто яшчэ не звяртаецца, — гэта людзі, якія жывуць учарашнім днём. Яны затрымаліся ў XX стагоддзі. Час жа, як ведаеце, ідзе па спіралі. І калі ў сярэдзіне мінулага стагоддзя было модна чытаць літаратурныя выданні, то ў канцы XX стагоддзя гэта перастала быць модным. Але сёння, на другім дзясятку XXI стагоддзя, гэта зноў выходзіць у авангард. А наогул, каб быць менеджарам у літаратурным выданні, трэба быць асобай рамантычнай. Як гэта ні парадаксальна гучыць. Таму, напэўна, і прыцягваюцца цяпер у гэту сферу жанчыны. Першай у «Маладосці» была Раіса Андрэеўна Баравікова. Менавіта яна задала тон менеджарскім кірункам і паказала свае менеджарскія якасці. І ёй удалося вывесці часопіс, які друкаваўся на той момант раз на паўгода, на ўзровень якаснага штомесячнага выдання. Мужчына са сваім прагматычным розумам з гэтай задачай — назавем яе маркетызацыяй выдання — наўрад ці справіўся б.

### УВАГА! АКЦЫЯ!

**— Калі мы ўжо загаварылі пра маркетызацыю, то як вы імкняцеся дабіцца поспеху і пашырэння кола чытачоў? Апошнія гады «Маладосць» пастаянна эксперыментуе з вонкавым выглядам, ці працуе гэта на прыцягненне ўвагі?**

— Наконт прыцягнення ўвагі сказаць цяжка, таму што тыя працэсы, якія за ўсё гэта адказваюць, вельмі марудныя. Але наклад часопіса не змяншаецца, а з апошнім рэбрэндынгам цікавасць да яго павялічылася. Тут вялікую ролю сыграла, напэўна, тое, што ў нас з'явіўся ўласны сайт. Хоць пакуль што гэта «трэніровачная версія» — неўзабаве з'явіцца паўнацэнны сайт, створаны па ўсіх законах «жанру». Акрамя гэтага, мы размяшчаем анонсы свежых нумароў на сайтах вядучых універсітэтаў краіны і рэкламуем «Маладосць» у вагонах метрапалітэна — віншуем краіну з днямі нараджэння класікаў. Хутка ў нас распачнецца вельмі цікавая акцыя. Мы запрашаем падпісацца на другое паўгоддзе «Маладосці» і атрымаць у падарунак часопіс з аўтографам вядомага пісьменніка. Будзем дарыць архіўныя часопісы 1950-х гадоў. Гэта цікава.




Нумар «Маладосці» за кастрычнік 1964 года.

**— А каму ў галаву прыходзяць усе гэтыя ідэі?**

— Ідэя архіўнага часопіса — рамантычная менеджарская ідэя. Астатнія супрацоўнікі нашай рэдакцыі па-ранейшаму з'яўляюцца паэтамі і празаікамі. І таму мне нічога не застаецца, як толькі штудзіраваць кнігі па маркетынгу, чытаць артыкулы пра стварэнне часопісаў і кіравацца фразамі кштату «А колькі свежых ідэй прыйшло ў вашу галаву за апошнія 24 гадзіны?». Можа быць, гэта не шмат, і можна было рабіць больш, але... Па вялікім рахунку, паспяхова мы можам рабіць толькі тое, што нам хочацца рабіць.

**Зоя СВЕТЛАЯ.**

*Спорт новага пакалення*

## МІНСК ПРЫМАЕ КІБЕРФЕСТЫВАЛЬ

**Грандыёзнае IT-мерапрыемства TECHLABS CUP праводзіцца ў чатырох краінах СНД — Расіі, Казахстане, Украіне, і з мінулага года — у Беларусі. Пасля адборачнага турніру, які будзе праходзіць з 27 красавіка па 5 мая, лепшыя кіберспартсмены сустрэнуцца ў Мінску ў гандлёвым цэнтры «Сталіца» на міжнародным фестывалі TECHLABS CUP BY 2013. Уваход на мерапрыемства будзе вольным.**

Колькасць удзельнікаў усіх чатырох фестываляў год таму дасягнула 10 тысяч чалавек, а колькасць гледачоў — 35 тысяч. Акрамя таго, анлайн-трансляцыі ў інтэрнэце паглядзела каля паўмільёна чалавек. Першае з серыі сёлетніх мерапрыемстваў ужо прайшло ў Маскве. На гэты раз толькі адзін фестываль сабраў ужо 25 тысяч гледачоў. На спаборніцтвы ў беларускую сталіцу прыедуць энтузіясты з Польшчы, Расіі, Украіны.

Мінскія спаборніцтвы пройдуць у двух фарматах: непасрэдна ў кіберспорце і аверклокінгу. Дысцыплінамі для кіберспорту сёлета сталі 5 камп'ютарных гульняў: World of Tanks (сусветна вядомы сімулятар танкаў, створаны беларускімі праграмістамі), Shadow Company (новая гульня ў жанры шутара з удзелам адразу трох камандаў), DOTA 2 (камандная гульня ў жанры стратэгіі, заснаваная на тактычным узаемадзеянні гульцоў), Counter Strike: Global Offensive (традыцыйная і адна з найбольш папулярных камп'ютарных гульняў у жанры каманднага шутара) і Star Craft II (камп'ютарная гульня ў жанры стратэгіі ў рэальным часе).

Асобна вылучаны спаборніцтвы па аверклокінгу — раскрыцці гранічных магчымасцяў камп'ютара. Ключавую ролю у гэтых спаборніцтвах адыгрывае веданне тэхнічнага напаўнення камп'ютара і ўменне выціснуць з машыны максімум, не спаліўшы яе. У гэтай дысцыпліне выкарыстоўваецца моцнае ахаладжэнне камп'ютара з дапамогай вадкага азоту.

На прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Ігар Бузоўскі паведаміў: «Перад намі доўга стаяла пытанне: падтрымліваць ці не такую з'яву, як кіберспорт. Нарэшце, мы выпрацавалі прынцыповую пазіцыю БРСМ не толькі ў дачыненні да камп'ютарнага спорту, але і да іншых субкультур: гэта неабходна падтрымліваць». Ігар Бузоўскі, які адначасова з'яўляецца яшчэ і намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, таксама зазначыў: «У нас ужо ёсць чым ганарыцца ў сферы камп'ютарнага спорту. Федэрацыі кіберспорту пакуль няма, але калі з'явіцца такая ініцыятыва, мы яе абавязкова падтрымаем».

Для ўдзельнікаў і гледачоў мінскага фестывалю арганізатары падрыхтавалі некалькі сюрпрызаў. Напрыклад, на чэмпіянат па Star Craft II запрасілі наймацнейшага беларускага гульца Антона Плебановіча (выступае пад нікам LoWeLy) і аднаго з самых папулярных кіберспартсменаў свету з Украіны — Аляксея Крупніка (White-Ra). Лепшыя кіберспартсмены атрымаюць ад 1,5 тысячы да 7,5 тысячы долараў у залежнасці ад дысцыпліны і занятага месца.

Прадстаўнік кампаніі, якая стварыла гульню World of Tanks, Аляксей Кузняцоў зазначыў: «Кіберспорт — гэта спорт новага пакалення. Тут няма допінгу і несправядлівай гульні».

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

*З шырока расплюшчанымі вачыма*

# «ПЯШЧОТНЫ» ГОРАД,

## або Гісторыя аднаго нечаканага падарожжа

**Тэлефануе мне Наташка:**
**— Зможаш узяць адгул на заўтра?**
**— Дапусцім. А навошта?**
**— Мы едзем у Мінск.**
**— О, Божа! А чаму так рэзка?**
**— Заўтра ноччу там будзе праходзіць міжнародны фестываль транс-музыкі. Армін ван Бюўрэн, Дан Берлін... Слухай, якая розніца?**
**— Ніякай, толькі білетаў на цягнік не дастанем. Колькі нас народу?**
**— Ты, я, Юлька.**
**— На машыне?**
**— Ага.**
**— Ну, рабі «зялёную карту», каб не на мяжы, купляйце білеты на фестываль, кватэру я зніму.**

Дваццаць хвілін у інтэрнэце — і спецыяліст Насця хутка падабрала нам кватэру ў самым сэрцы горада, на праспекце Незалежнасці, насупраць плошчы Перамогі. Два пакоі, балкон, еўрарамонт, 75 долараў у суткі за ўсё. Прыгажосць. Абяцалі нас сустрэць незалежна ад часу прыбыцця. Сэрвіс з чалавечым тварам.

Пасля працы мы паехалі па дамах збірацца. У сумцы — майка для танцаў, цёплая кофта для прагулак па горадзе, піжама, бялізна, касметыка. Скочылі ў джынсы і таўстоўкі, боцікі без абцасаў, курткі — гатова! З трох халадзільнікаў агульнымі намаганнямі сабраныя хлеб, каўбаса, сыр, вада і цукеркі. Прыехалі да Наташкі, ляглі спаць. У 4 раніцы пад'ём, маскоўскі тваражок, кава — і з рэчамі на выхад.

5 раніцы. Выязджаем з Масквы па трасе М1. Рыжыя ліхтары асвятляюць наш шлях, гучыць Jamiriquai, палёт нармальны. Я сплю і спрабую настроіцца на міні-водпуск.

7 раніцы. Вакол рэдкія бярозкі, сосны. У люстэрках задняга віду неба пачынае цяплець, святае.

9 раніцы. Гучыць ЯНСР, мы танцуем. Уздоўж бартоў сасновы лес, сонейка. Праязджаем Смаленск.

— Дзяўчаты, я ж зусім забылася. Пераедзем мяжу — не перавышаем хуткасць увогуле, ад слова «зусім». У Беларусі сур'ёзна штрафуюць нават за перавышэнне 10 км у гадзіну, прычым гэта не абмяркоўваецца: ні адкупіцца, ні адгаварыцца. І нічога, што ў нас няма мясцовых «зайчыкаў» — адбяруць правы, адправяць у райцэнтр чакаць адкрыцця банка з абменнікам.

— Соня, страшылкі расказваць трэба на захадзе, а не на світанку.

— Я сур'ёзна. Там вельмі строгія «даішнікі» і міліцыянеры. Гэта ўвогуле адзіная краіна ў свеце, дзе я пабывала ў аддзяленні міліцыі.

— Няўжо?

**Але перш адзначылі, што ў нас такі кефір прадаваўся б па высокай цане ў шкляной бутэльцы з лаканічнай моднай этыкеткай пра «бія», «эка», «жывы» — усё па правілах маркетынгавых тэхналогій.**

— Ну так, — усміхаюся я. — Мы гулялі па Бабруйску са стрыечным братам (яму толькі споўнілася 18) і дзвюма 15-гадовымі сёстрамі, спявалі песні ў 3 гадзіны ночы. Карацей, не вельмі буянілі, але нас усё ж забралі ў кутузку з пытаннем да брата: «Добра табе гуляць ноччу з трыма непаўналетнімі дзяўчатамі?». Брат нядобра буркнуў: «Мне — выдатна. А што?» — і панеслася... Адпусцілі нас хутка, таму што прозвішчы ва ўсіх аказаліся аднолькавымі і асаблівых парушэнняў за намі не значылася. Але той выпадак я запомніла. І яшчэ, дарогу там пераходзім таксама па правілах — або па «зебры», або на зялёнае святло. Зловяць — аштрафуюць.

— І ў кутузку?

— Хочаш праверыць?

Ігрaла група «Сакрэт», мы падпявалі. І нават не зразумелі, у які момант пераселі мяжу саюзнай Рэспублікі Беларусь. Калі б не ўказальнікі «Віцебск», «Масква», мы б і не заўважылі.

○ ○ ○

11 раніцы — папярэджваем Насцю, што мы ўжо на пад'ездзе да Мінска.

Уключаем мясцовае радыё. Ніколі раней не чула радыёрэкламу мясных і малочных прадуктаў.

Праязджаем Курган Славы, затым з М1 гэтак жа па прамой уязджаем у Мінск, адразу на даўжэзны праспект Незалежнасці. І наша першае яскравае ўражанне ад горада — «Брыльянт» — сучасны будынак Нацыянальнай бібліятэкі.

А далей зноў пачынаецца быццам бы амаль Масква — сталінскі ампір, шырокія вуліцы. Але паўсюль чыста, машын зусім не шмат, усе едуць ціхенька, захоўваючы хуткасны рэжым. Наташа за рулём трымае паставу.

Праз 7 гадзін пасля старту з Масквы, а 12-й дня каля ўваходу ў рэстаран у Мінску нас сустракае Венцыслаў і вядзе ў нашы апартаменты — як высветлілася, класа «люкс».

— Венцыслаў, якое прыгожае ў вас імя! Беларускае?

— Сербскае. Я ўвогуле адтуль.

— Ух ты! А як вы апынуліся тут?

— У савецкі час прыехаў у БДУ па абмене, закахаўся ў прыгожую беларускую дзяўчыну, ажаніўся — і мы засталіся тут. Я быў не супраць: прыгожая краіна. Людзі тут цудоўныя. Ну, вы хутка гэта таксама зразумееце, — усміхаецца. — Дык што вам падказаць? Абменнік ведаеце дзе? Пойдзем на балкон, пакажу. Вунь там добры рэстаран беларускай кухні, там кавярня добрая. Прагуляйцеся да цырка — яго адрамантавалі нядаўна, ён цяпер суперсучасны. Паглядзіце Траецкае прадмесце і раён Нямігі. Карта ёсць? Давайце намалюю.

**— І ўсё ж часам мне здаецца, што я ў Маскве.**
**— Сяброўка, ты што? Мы ідзём па цэнтральнай вуліцы горада ў час пік, а я мала таго, што магу дыхаць — я яшчэ цябе і чую!**

Паснедаўшы свежым батонам са смачным мясцовым кефірам, густым і тлустым, але ўпакаваным зусім без пафасу (не ў прыклад Маскве), мы вырашылі адпачыць з дарогі і паспаць. Але перш адзначылі, што ў нас такі кефір прадаваўся б па высокай цане ў шкляной бутэльцы з лаканічнай моднай этыкеткай пра «бія», «эка», «жывы» — усё па правілах маркетынгавых тэхналогій.

Прачнуліся ўвечары, выйшлі з дома, калі сонца павольна стала чырванець і спускацца бліжэй да гарызонту. Прамы і бясконцы праспект Незалежнасці імкнуўся да краю зямлі, праціраючыся пасталінчаму і па-савецку грандыёзна. Чароўнасць беларускай мовы на шыльдах: «цырульня», «прадукты», «уваход», «міліцыя», «чытайце мінскую «вячорку»... І тут Юля кажа:

— І ўсё ж часам мне здаецца, што я ў Маскве.

— Сяброўка, ты што? Мы ідзём па цэнтральнай вуліцы горада ў час пік, а я мала таго, што магу дыхаць — я яшчэ цябе і чую!

— О, і праўда: амаль 7 вечара, а нават «пробкі» няма...

У кавярні, пагартаўшы меню, мы смяяліся, што так «дорага» ежа не каштуе нават у Куршавелі. За тры порцыі салаты і дранікаў з добрай порцыяй смятаны, са скваркамі і смажанкамі, ды яшчэ за тры збітні з журавін мы аддалі каля 150 тысяч рублёў. Беларускіх, зразумела. Каб перавесці суму ў рускія рублі, падзяліце на 270... І гэта на траіх, за порцыі «ад пуза», у цэнтры горада, у вельмі прыстойным рэстаране беларускай кухні.

○ ○ ○

Ноччу мы ўзялі таксі, каб прыехаць у канцэртхол «Мінск-Арэна». Па дарозе добры таксіст расказаў нам, што ён родам з Хабараўска, але ў 1970-я гады пераехаў з сям'ёй сюды.

— Чаму?

— Мне тут больш падабаецца. Людзі іншыя. І паглядзіце, як тут чыста. Гэта не бацька, як усе думаюць, — гэта людзі. Так склалася гістарычна. Колькі сябе памятаю, заўсёды так было.

У «такса-эфіры» праз шыпенне чуўся дабрадушны абмен мужчынскімі салёнымі жартамі калег-таксістаў. Наш вадзіцель пасля чарговай рэплікі ўзяў у рукі рацыю і строгім голасам вымавіў: «Ромка, у мяне тут прыгожыя дзяўчаты едуць». І ў эфіры запанавала цішыня...

Калі мы праязджалі станцыю метро «Няміга», таксіст расказаў нам пра выпадак таўкатні падчас рок-канцэрта, калі пасля выступлення групы «Ногу свело» пачаўся лівень, і народ хлынуў у метро. І пра тэрарыстычны акт у метро расказаў. І пра яшчэ адзін, на месцы, дзе кіраўнік дзяржавы прымае парады. Па дарозе назад іншы таксіст нам расказаў пра тыя ж падзеі. Гэта я да таго, што ў сталіцы Беларусі, у адрозненне ад нашай сталіцы, усё параўнальна спакойна.

У тым, што ўсё спакойна, мы пераканаліся, трапіўшы ў самую гушчу фестывалю транс-музыкі. Некалькі чалавек у сонечных акулярах на танцпляцоўцы, парачка п'яных... І ўсё. У асноўным з 15 тысяч прысутных народ быў «пры свядомасці» і ветлівы; мноства пільных ахоўнікаў, якія таксама, трэба адзначыць, агрэсіі не праяўлялі. Я сапраўды адчувала сябе ў бяспецы — нават нягледзячы на тое, што ў барах «Арэны» было даволі сумна і пасядзець не было дзе.

Затое ў нас засталося мноства фотаздымкаў — на ўсіх мы танцуем з заплюшчанымі вачыма, усміхаючыся ад задавальнення і кожнай клетачкай адчуваючы «касмічныя» гукі музыкі.

На наступны дзень мы гулялі па горадзе: раён Нямігі, набярэжная Свіслачы, Траецкае прадмесце з лавачкамі і маленькімі кавярнямі «першай нацэначнай катэгорыі», як нас сумленна папярэджвалі надпісы на ўваходзе. Верхні горад з яго ратушай, касцёламі і саборамі... Кожны раз, калі нешта пыталіся ў людзей, мы атрымлівалі падрабязны разгорнуты адказ.

У цэлым, твар Мінска — гэта сталінская забудова 1950-х гадоў. У старым горадзе сустракаліся астраўкі з дамамі XIX стагоддзя — з любоўю захаваныя, акуратныя. Наогул пра Мінск хочацца сказаць, што горад «даволі пяшчотны» — у тым сэнсе, у якім гэты выраз выкарыстоўвае мой знаёмы журналіст — як сінонім слова «добры». У сувенірных крамках выдатныя вырабы з дрэва, керамікі і гліны, шкатулкі з берасцяным і саламяным аздабленнем, самыя розныя фантазіі на тэму скураных упрыгажэнняў і аксесуараў. На «пакупніцкай хвалі» мы трапілі на плошчу Незалежнасці (станцыя метро, як ні дзіўна, называецца «Плошча Леніна» — дзякуй групе беларускіх студэнтаў, якія, заўважыўшы збянтэжанасць на нашых тварах, самі прапанавалі сваю дапамогу). Там мы агледзелі Чырвоны касцёл з незвычайнымі шлейфамі тканіны аметыставага колеру — нідзе ў касцёлах яшчэ не сустракала такой дэталі інтэр'еру. Або не звяртала ўвагі?

**Наогул пра Мінск хочацца сказаць, што горад «даволі пяшчотны» — у тым сэнсе, у якім гэты выраз выкарыстоўвае мой знаёмы журналіст — як сінонім слова «добры».**

Назад да метро мы вярталіся праз падземны гандлёвы цэнтр, а пасля з вялізнымі пакетамі беларускай касметыкі ў руках з цяжкасцю дацягнуліся дадому. Кожная прынесла ў «норку» кілаграмаў па 7 геляў, крэмаў і масак. Аддалі пры гэтым не больш як 40 долараў кожная. І «мазілкі» ўсе выдатнай якасці!

○ ○ ○

Так прайшоў яшчэ адзін дзень, а наступнай раніцай чароўная Насця прымала назад ключы ад «нашай» кватэры. Спытала, ці не з Масквы мы і ці не на фестываль прыехалі. Пачуўшы сцвярджальны адказ, яна патлумачыла:

— Каля 20 кватэр нашага агенцтва з учарашняга дня акупавана масквічамі, і сёння ўсе выязджаюць. Мы рады, што так адбываецца, што ў Мінск сталі часцей прыязджаць турысты. Для нас такія міжнародныя фестывалі пакуль у навіну. Я рада, што вам спадабалася.

Калі на зваротным шляху мы праехалі цудоўнае сяло Рамашкава, трымаючы курс на Маскву, калі назва сталіцы зноў пачала пісацца праз «о», я падумала: «Якая, усё-такі, цудоўная рэч — канікулы!» Асабліва калі яны праходзяць так цудоўна!

**Соф'я МАРТЫНКЕВІЧ,**
*Санкт-Пецярбург.*



## Закрытое акционерное общество «Белремстройторг» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже недвижимого имущества:

| № лота | Наименование имущества | Место нахождения имущества | Собственник | Начальная цена продажи лота, с уценкой на 10%, рублей (без учета НДС) | Задаток 5%, рублей (без учета НДС) | Сумма шага аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | ИМУЩЕСТВА (без учета НДС) | | | | | |
| 1 | Дебиторская задолженность Севостьянов Андрей Леонидович | г. Гомель, ул. Молодости, 5 | 21480671 | 21482638 | 1074034 | 1074034 |

Организатор торгов – управляющий в деле о банкротстве ЗАО «Белремстройторг» Будков Д.В.

С имуществом можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 9.00 до 17.30.

Задаток перечисляется **до 16.05.2013 г.** (включительно), на р/с № 3012751058016 – текущий в белорусских рублях в ЦКО № 3 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, МФО 153001739, УНП 400030096.

Условия продажи – без условий.

С лотом можно ознакомиться с 10.00 по 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, д. 5.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 календарных дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 календарных дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление с приложением: для юридических лиц – заверенные копии свидетельства о гос. регистрации, устав; для индивидуального предпринимателя – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копия паспорта.

Срок подачи заявления с момента выхода настоящего объявления **до 16.00. 16.05.2013 года по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5.**

Дата, время, место проведения открытого аукциона **17.05.2013 года в 14.00, г. Гомель, ул. Молодости, 5.**

**По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: (8029) 655 33 68; (8029) 621 22 36.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 06 мая 2013 года ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ С УСЛОВИЯМИ ПО ПРОДАЖЕ КВАРТИР, расположенных в жилом доме по адресу: г. Минск, ул. Скрипникова, д. 15

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)

| № | Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Местонахождение предмета торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | квартира общей площадью 68,6 кв.м, инвентарный номер 500/D-7061259 (двухкомнатная, расположена на 4 этаже) | г. Минск, ул. Скрипникова, д. 15, кв. 31 | 666 900 000 | 67 000 000 |
| 2. | квартира общей площадью 81,1 кв.м, инвентарный номер 500/D-7061263 (трехкомнатная, расположена на 5 этаже) | г. Минск, ул. Скрипникова, д. 15, кв. 35 | 769 500 000 | 77 000 000 |
| 3. | квартира общей площадью 68,8 кв.м, инвентарный номер 500/D-7061267 (двухкомнатная, расположена на 5 этаже) | г. Минск, ул. Скрипникова, д. 15, кв. 39 | 666 900 000 | 67 000 000 |
| 4. | квартира общей площадью 78,3 кв.м, инвентарный номер 500/D-7061281 (трехкомнатная, расположена на 7 этаже) | г. Минск, ул. Скрипникова, д. 15, кв. 53 | 735 300 000 | 74 000 000 |
| 5. | квартира общей площадью 68,1 кв.м, инвентарный номер 500/D-7061323 (двухкомнатная, расположена на 12 этаже) | г. Минск, ул. Скрипникова, д. 15, кв. 95 | 658 350 000 | 66 000 000 |
| 6. | квартира общей площадью 44,9 кв.м, инвентарный номер 500/D-7061254 (однокомнатная, расположена на 4 этаже) | г. Минск, ул. Скрипникова, д. 15, кв. 26 | 470 250 000 | 47 000 000 |
| 7. | квартира общей площадью 45,4 кв.м, инвентарный номер 500/D-70612558 (однокомнатная, расположена на 4 этаже) | г. Минск, ул. Скрипникова, д. 15, кв. 30 | 478 800 000 | 49 000 000 |
| 8. | квартира общей площадью 47,5 кв.м, инвентарный номер 500/D-7061264 (однокомнатная, расположена на 5 этаже) | г. Минск, ул. Скрипникова, д. 15, кв. 36 | 495 900 000 | 50 000 000 |
| 9. | квартира общей площадью 45,3 кв.м, инвентарный номер 500/D-7061270 (однокомнатная, расположена на 6 этаже) | г. Минск, ул. Скрипникова, д. 15, кв. 42 | 478 800 000 | 48 000 000 |

Организатор торгов – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов – оплата победителем торгов (покупателем) вознаграждения за организацию и проведение торгов в размере 1,5 процента от окончательной цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 календарных дней со дня их проведения.

Торги проводятся в соответствии со статьями 417 и 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (в случае участия в торгах в отношении нескольких предметов торгов задаток вносится для каждого из этих предметов торгов), заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также предоставившие организатору торгов в установленный срок следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о государственной регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию документа, подтверждающего внесение задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (окончательная цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов путем перечисления денежных средств на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем перехода права собственности, оплачиваются победителем торгов (покупателем).

Торги проводятся **06 мая 2013 года в 16.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляется **с 22.04.2013 по 02.05.2013 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327 40 22, (017) 327 48 36 (УП «Минский городской центр недвижимости»).**

**По вопросу осмотра квартир следует обращаться по телефону (017) 313 06 92 (товарищество собственников).**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

| 1 | Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов | Аукцион состоится 3 мая 2013 г. в 11.00 по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45<br>КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью» | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | Срок приема документов | с 9.00 до 17.00 по рабочим дням по 30 апреля 2013 года | | | | |
| 3 | Номер лота | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 4 | Адрес земельного участка | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, микрорайон 19 (вблизи магазина «Заводской») | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Карла Маркса | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Петровского (вблизи райисполкома) | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, микрорайон 3 | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, пересечение улиц Ленинградской и Полевой |
| 5 | Кадастровый номер участка | 321850100002003305 | 321850100002003304 | 321850100002003308 | 321850100004002546 | 321850100001001703 |
| 6 | Площадь, га | 0,0150 га | 0,0300 га | 0,0300 га | 0,0050 га | 0,0627 га |
| 7 | Целевое назначение | для обслуживания площадки под сезонную торговлю (размещение объектов розничной торговли) | для обслуживания площадки под сезонную торговлю (размещение объектов розничной торговли) | для обслуживания площадки под сезонную торговлю (размещение объектов розничной торговли) | для обслуживания площадки под сезонную торговлю (размещение объектов розничной торговли) | для строительства и обслуживания торгового комплекса (для размещения объектов розничной торговли) |
| 8 | Срок аренды | 3 года | 3 года | 3 года | 3 года | 50 (пятьдесят) лет |
| 9 | Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций; строений и сооружений; инженерно-геологические условия | Участок свободен от застройки (инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ) | | | | |
| 10 | Условия и ограничения | 1. победителю либо единственному участнику несостоявшегося аукциона в течение 10 рабочих дней с даты утверждения протокола результатов аукциона (либо признания аукциона несостоявшимся):<br>- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>- возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков;<br>2. после совершения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона действий, названных в п. 1, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с Жлобинским районным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды государственную регистрацию прав, ограничений прав на земельный участок;<br>3. получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение Жлобинского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку проекта благоустройства территории в сроки, определенные заказчиком;<br>4. приступить к занятию земельного участка в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации;<br>5. снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проектной документации;<br>6. завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией | | | | |
| | | 7. 0,0150 – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения | 7. 0,0077 – охранная зона линии электропередачи | | | |
| 11 | Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории | Подключение к общим сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД. | | | | |
| 12 | Начальная стоимость, рублей | 3 393 412 | 6 958 651 | 7 957 161 | 1 032 592 | 51 344 443 |
| 13 | Сумма задатка, рублей | 600 000 | 1 300 000 | 1 500 000 | 100 000 | 5 000 000 |
| 14 | Затраты по изготовлению землеустроительной документации, рублей | 3 332 970 | 3 095 345 | 3 375 770 | 3 020 932 | 3 579 880 |
| 15 | Стоимость расходов по организации и проведению аукциона (ориентировочно), рублей | 1 000 000 | 1 000 000 | 1 000 000 | 1 000 000 | 1 000 000 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь 26.03.2008 г. № 462.

Организатор торгов – КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью».

Документы принимаются по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45 (подъезд 2, 1 этаж) по рабочим дням **с 22 апреля 2013 года по 30 апреля 2013 года (с 9.00 до 17.00).**

Перечисление суммы задатка осуществляется на расчетный счет Организатора аукциона № 3012006530013 в филиале № 312 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жлобин, код МФО 151501673, УНН 490317354, сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) подает необходимые документы для участия в аукционе.

Всем желающим представляется возможность предварительно ознакомиться с документами по объекту и с объектом в натуре. Контактные телефоны: 8 (02334) 3 14 08, 2 18 18.

**Объявления о проведении предыдущих аукционов были опубликованы в газете «Звязда» № 223 от 20.11.2012 года и № 187 от 27.09.2013 года.**

**Полный текст извещения о проведении аукциона размещен на сайте Жлобинского райисполкома gisp.by**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

18 04 2013 г.

SEX—БАЛЯСЫ

**Без абвяшчэння аніякіх патрабаванняў і неяк раптоўна перадавыя атрады дзяўчат — «лёгкая кавалерыя» — нанеслі ўдар па мужчынскім «эга»: даўжыня іх спадніц літаральна ў адно імгненне дасягнула свайго «гістарычнага мінімуму», што, тым не менш, не перашкаджае асобным прадстаўніцам прыгожага полу прадпрымаць звышсмелыя спробы «выскачыць» і за яго. Дзе там плаўнасць пераходаў, прадказальнасць сітуацыі? Эх, вясна, што ж ты, подлая, нарабіла? Затрымалася ты сёлета, доўга ішла да нас, стаміла чаканнем і вось — на табе! Жанчыны не ў прыклад мінулым гадам бязлітасна паляць «напалмам відовішча» неакрэплыя яшчэ пасля зімовага застою мужчынскія вочы, сэрцы і душы. Моцны пол толькі прымярае ў думках свае будучыя веснавыя строі, а прыгожы, не чакаючы «міласці ад прыроды», ужо — як сцяг перамен і нязменнай перамогі — носіць іх. І гэта яшчэ іх «асноўныя сілы» не падцягнуліся, імя якім — легіён...**

# АДКУЛЬ У ВЯСНЫ НОГІ РАСТУЦЬ

...Што казаць, сёлета толькі лянівы не панаракаў на надвор'е. А ўжо колькі анекдотаў было складзена!.. «Перажылі зіму са снегам, засталася перажыць і вясну са снегам». «Урад падманвае насельніцтва, сцвярджаючы, што сакавік — вясенні месяц». «1 верасня 2013 года. Першакласнікі ідуць у школы з букецікамі падснежнікаў»... Можна смела сцвярджаць, што ўсе іх прыдумалі мужчыны. У жанчыны не бывае такога, каб вясны не было. Тут у яе ўсё проста і лагічна. Як у тым анекдоце пра дыназаўра, памятаеце? Спыталі неяк вучоныя ў мужчыны: маўляў, на ваш погляд, якія шанцы сустрэць жывога дыназаўра? Той у адказ нейкія выкладкі, а ў канцы, зыходзячы з гэтага, — «адзін шанц на трыльён». Задалі тое ж пытанне жанчыне. І пачулі: «Пяцьдзясят працэнтаў на пяцьдзясят». «Гэта як?» — здзівіліся вучоныя. «А проста: або сустрэну, або не».

...Яна цягам доўгіх і нудотных зімовых месяцаў набывае новыя купальнікі, маечкі, шорцікі, прыглядаецца да новых сумачак, як бы здалёк і без дай прычыны пачынае гаварыць нешта пра мора... І пасля ўсяго гэтага — вясны сёлета не будзе? Мне падаецца, як ні дзіўна прагучыць, што для жанчыны прасцей і нават больш рацыянальна паверыць у канец свету, чым у такое глупства.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**...Яна цягам доўгіх і нудотных зімовых месяцаў набывае новыя купальнікі, маечкі, шорцікі, прыглядаецца да новых сумачак, як бы здалёк і без дай прычыны пачынае гаварыць нешта пра мора... І пасля ўсяго гэтага — вясны сёлета не будзе?**

Прыгожы пол пачынае калі не сустракаць, дык гукаць вясну незалежна ад таго, што мы бачым за акном. Падаецца, у сярэдзіне сакавіка інтэрнэт абляцелі фотаздымкі дзвюх дзяўчат, якія каталіся ў цэнтры Кіева на сноўбордзе. З адзення на іх былі толькі рукавіцы ды шапачкі з шалікамі... Не ведаю, магчыма, прайгралі якое пары. А можа, усё ж — вясну гукалі?.. Прыкладна ў той жа час ці то ў Расіі, ці то зноў жа ва Украіне нудзісты палезлі «маржаваць». На першым плане — дзяўчаты з цюльпанамі ў руках...Ужо днямі ў сеціве з'явяліся іншыя фотаздымкі, быццам бы зробленыя на Сахаліне. На іх пяць дзяўчат смела «рассякаюць» па горадзе ў летніх туфлях на вялікіх абцасах і ў адной ніжняй бялізне — на фоне гурбаў снегу навокал... З убачанага там жа. Кітайскі стрынгер пры дапамозе доўгафокуснага аб'ектыва здымае тэрыторыю Паўночнай Карэі, выязджаючы на сярэдзіну пагранічнай з Кітаем ракі. І вось у яго кадр патрапіў пагранічны нарад з чатырох дзяўчат... на высокіх абцасах. Гэта, вядома, не ніжняя бялізна, але і гаворка пра Паўночную Карэю і дзяўчат-вайскоўцаў. Ідуць у шарэнзе ў вайсковай форме колеру хакі. У першай і апошняй за плячыма — аўтаматы. А абцасы ў кожнай — ну нібы ў тых самых дзяўчат з Сахаліна... На гэтым фоне цалкам можна зразумець цюменскага муфція, які ўжо зараз (!) выступіў з заклікам да дзяўчат быць больш асцярожнымі з мінімалізмам у адзенні. Калі сёння такое назіраецца, дык чаго ж чакаць, калі градус паветра істотна павялічыцца?..

Нашы дзяўчаты больш сціплыя, але не менш рашучыя. Запомніліся словы госця краіны, які сказаў, што быў узрушаны, пабачыўшы, як беларускі сустрэлі Хаўер — на абцасах! Адной знаёмай на працы кіраўніцтва, пабачыўшы яе смелы строй, так і сказала: «Хочаш зіму напалохаць?» А што, яны такія, беларускія дзяўчаты!

Як бачым, па ўсім свеце назіраецца практычна аднолькавая карціна. Як той казаў, вырвалася быццам з палону вясна... Цяпер зразумела, адкуль у яе ногі растуць і як яны выглядаюць. З апошнім, праўда, казусы могуць здарыцца... Менавіта ў гэты час жанчыны, як ніколі, не адчуваюць свайго ўзросту — прынамсі, часам бывае, не хочуць яго адчуваць. Ідзе ўперадзе такая «німфа», ногі аголеныя па самае «не балавацца». Нават шкада тую дзяўчыну: куды ж ты, дурненькая, пры такім яшчэ не вельмі «лётным» надвор'і — ды са спадніцай «па пэйджар»? Абернецца такая «бярозка стройная» — дык ёй пад ...дзясят. Эх, вясна, вясна, думкі летуценныя, узросту непадуладныя. «Адзін раз у год сады цвітуць»...

...Усё гэта нам, вядома, падабаецца. Толькі вы гэта, дзяўчаты, больш асцярожнымі будзьце... Здароўе даражэй. Тым больш — вясна ўсё роўна будзе, абяцаем!

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

Чытанне пад коўдрай

# Чаго не хапала ў асабістым жыцці Джэн Эйр?..

**Усё сеціва літаральна перапоўнена рознага роду фанфікамі — масавай літаратурай, створанай прыхільнікамі мастацкага твора па яго матывах. Дзеля чаго гэта робіцца? Каб не даць згаснуць бязмежнай любові да нейкай кнігі: фанфікі яднаюць фанатаў твора і забяспечваюць пэўную бясконцасць улюбёнага сюжэта.**
**Вы ж ведаеце, як бывае крыўдна, калі на працягу ўсяго сюжэта ты з заміраннем сэрца чакаеш развязкі любоўнай (рамантычнай) лініі, а потым аўтар — бац! — і перакрэслівае асалоду невыразным заканчэннем? А хтосьці з фанатаў — на жаль, свету невядома, хто гэты чалавек, — знайшоў выхад: навошта сумаваць па няскончаным сюжэце, калі... можна дапісаць кніжку самастойна!**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Людзям цікава сачыць за любоўнай лініяй у творах. Гэта нармальна, што чалавека цягне да іншага чалавека, — так задумана прыродай. Але ёсць тыя, каго кніжныя раманы прываблівaюць асабліва — падлеткі. Колькі дзявочых слёз пралілося на старонкі «Джэн Эйр»!..

Але зацікаўленасць фанфікамі (на першы погляд, бяскрыўдным хобі) бывае, заходзіць занадта далёка: найбольш папулярнымі «творамі» становяцца тыя, дзе абавязкова прысутнічаюць сцэны сексуальнага характару, прычым нярэдка яны звязаны з BDSM.

**ДАВЕДКА:**
*Абрэвіятура BDSM складаецца з трох частак, якія расшыфроўваюцца як назвы асноўных складнікаў гэтай з'явы: BD (Bondage & Discipline — звязванне і дысцыпліна), DS (Domination & Submission — дамінаванне і падначаленне) і SM (Sadism & Masochism — садызм і мазахізм). Гэтая субкультура заснавана на акцёрскіх гульнях у панаванне і падначаленне.*

Напэўна, не трэба казаць, што такія свавольствы ў літаратуры асабліва цікавяць падлеткаў. Вядома, у якім-небудзь «Ціхім Доне» ці «Яўгене Анегіне» пікантных дробязяў, якія б зацікавілі маладыя розумы, не знойдзеш! А сёння ўсё спрыяе таму, каб дзеткі як мага раней пазнаёміліся з прывабным светам эротыкі: акрамя фанфікаў, паступовa з'явілася яшчэ адна разнавіднасць для аматараў бясконцых сюжэтаў — ФРПГ.

**ДАВЕДКА:**
*ФРПГ — тэкставая ролевая гульня, якая праводзіцца на вэб-форумах. Назва паходзіць ад англійскай фразы Forum Role Playing Game. Выглядае як твор, які ствараецца групай аўтараў па чарзе: кожны з іх піша адпаведны фрагмент.*

Не дзіва, што ўдзельнікамі гэтых зусім не дзіцячых гульняў становяцца менавіта падлеткі. Па тэлевізары паказваюць фільмы з пасцельнымі сцэнамі, сайты запоўнены банерамі з эратычным зместам, рэклама робіць стаўкі на пахабныя асацыяцыі... Як тут не ўтрымацца і не дазнацца, што крыецца ў тайным, даступным толькі для дарослых свеце сексу?

Зразумела, што ў бацькоў пра гэта не запытаешся: здаецца, пры іх усё жыццё будзеш рабіць выгляд, што спіш на самых «гарачых» кадрах кінастужкі. Вось тут на дапамогу і прыходзіць сеціва. Падчас знаёмства з больш дасведчанымі ў сексуальным плане асобамі і з'яўляюцца «шэдэўры», на якіх было б правільна павесіць метку «18+».

**Зразумела, што ў бацькоў пра гэта не запытаешся: здаецца, пры іх усё жыццё будзеш рабіць выгляд, што спіш на самых «гарачых» кадрах кінастужкі.**

Фанфікаўскія форумы, вядома, не адзіная сфера, дзе падлеткі знаёмяцца с таемным светам эротыкі, але ж адна з найбольш даступных. Ёсць такая фраза: «Нам больш цікава не тое, пра што распавядаюць, а тое, што ўтойваюць». У гэтым выпадку яна спрацоўвае на ўсе сто працэнтаў. А потым, калі адкрываеш для сябе шмат чаго ў інтэрнэце, аказваецца: уся гэтая эротыка — вельмі прывабная рэч... І пачынаюцца кругазвароты спасылак і фотаздымкаў.

Зразумела, такую адукаванасць падлеткаў у галіне інтымных адносін можна неяк патлумачыць: час бяжыць, і большасць ранейшых правілаў ды канонаў сыходзяць у мінулае. Калі раней жанчыны насілі панталоны, то зараз ужо нікога не здзівіш стрынгамі ці ўвогуле фотаздымкамі «зорак» без бялізны.

Галоўнае пытанне: чаму? Чаму падлеткаў так цікавіць удзел у прыдумванні любоўных гісторый, закручанасці якіх могуць пазайздросціць бывалыя пісьменнікі? На адным з форумаў, прысвечаным ФРПГ, я знайшла аматарку гэтай забавы Mel. Менавіта такім віртуальным іменем шаснаццацігадовая дзяўчына называе сябе ў інтэрнэце. Наконт свайго хобі, якім яна захапляецца ўжо тры гады, разважае проста:

— Калі я нешта пішу — фанфік гэта ці проста ролевая гульня, — я сублімую. Усе падзеі, што я апісваю, — гэта тое, чаго мне не хапае ў рэальным жыцці. І маё захапленне ролевымі гульнямі звязана не столькі з «фізічнымі радасцямі», колькі проста з адносінамі, абдымкамі, эмоцыямі і хэпі-эндамі. Раскрыю сакрэт: для мяне, напрыклад, «фішка» не ў эротыцы, а ў асалодзе ад прыгожых моўных абаротаў ды тонкасці апісання дэталяў эмоцый і працэсу. Увогуле, я не прыхільнік форумаў: мне больш блізкі іншы варыянт развіцця падзей — знайсці родную душу і абменьвацца тэкстамі па e-mail, бо асабліва падабаецца ўсё гэта, калі разумееш, што па іншы бок экрана знаходзіцца твой духоўны сябар.

Здаецца, часам справа зусім не ў жаданні выплюхнуць агулам усе свае гармоны. Магчыма, такое хобі адыгрывае ролю доктара, які латае «эмацыянальныя прабелы»? Зразумела, што ў шаснаццаць гадоў усе падлеткі мараць аб прагулках пад ручку і пра бязвоблачную рамантыку. Але не ў кожнага атрымліваецца. Вось таму і сталі папулярныя хобі кшталту напісання фанфікаў ці ўдзелу ў ФРПГ.

**Раскрыю сакрэт: для мяне, напрыклад, «фішка» не ў эротыцы, а ў асалодзе ад прыгожых моўных абаротаў ды тонкасці апісання дэталяў эмоцый і працэсу.**

**Ганна ПЯРОВА.**

## УСЕ «ДВОЙКІ» — ПАД БАЦЬКОЎСКІ КАНТРОЛЬ!

Дзякуючы з'яўленню новага сэрвісу ў хуткім часе масквічы змогуць атрымліваць інфармацыю пра паспяховасць сваіх дзяцей у школе праз SMS-паведамленні або электронныя лісты. Цяпер бацькам будзе дастаткова замацаваць сваё дзіця з дапамогай унікальнага ідэнтыфікатара вучня і настроіць сістэму бясплатных паведамленняў: гэта могуць быць як SMS-паведамленні, так і паведамленні па электроннай пошце.

Цікава, што бацькі змогуць не проста атрымліваць важную інфармацыю пра школьныя адзнакі дзяцей, але і зрабіць запыт, каб удакладніць, за што менавіта была выстаўлена адзнака — за актыўнасць на ўроку або за рашэнне якой-небудзь задачы. Акрамя таго, у бацькоў будзе магчымасць адправіць заяўку на атрыманне паведамленняў у строга вызначаны час, што дазволіць ім не адцягваць сваю ўвагу ад работы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»;
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА.

Адрас рэдакцыі:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактны тэлефон: 292 44 12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013,
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 25.007.
Нумар падпісаны ў 19.30 17.04.2013 г.

**Крынічка**

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ, тэл. 287 18 27.

№ 11 (469)

# ГАРОШКАВЫЯ ТОНКАСЦІ

**Асабліва добра гарох расце пасля бульбы, морквы, буракоў, агуркоў, памідораў, гарбузоў, кабачкоў, капусты — гэта значыць, той гародніны, пад якую ў свой час унеслі добрыя дозы арганікі і мінеральных угнаенняў. А каб пазбегнуць развіцця хвароб і з'яўлення шкоднікаў, на ранейшае месца гарох лепш саджаць не раней, чым праз 4 гады.**

Для гароху лепш за ўсё падабраць сонечнае месца. Абсалютна не падыдуць кіслыя глебы. Іх трэба раскісляць, вапнаваць. Для гэтага выкарыстоўвайце гашаную вапну (150—300 г на квадратны метр) ці даламітавую муку (200—400 г на квадратны метр). Калі гэтага не зрабіць, расліны будуць кволымі і хворымі. Акрамя таго, глеба павінна быць друзлай, каб да каранёў лёгка паступалі вільгаць і паветра.

Участак для пасеву гароху лепш падрыхтаваць з восені. Малаўрадлівую зямлю запраўляюць кампостам ці перагноем (паўвядра на 1 квадратны метр). Увага! Свежы гной пад гарох не кладуць. Тады ж уносяць 20 г на квадратны метр калійнай солі, 40 г на квадратны метр суперфасфату (на кіслых глебах эфектыўней унесці фасфарытную муку —50 г на квадратны метр). Калі рыхтуеце градку толькі ўвесну, дадайце яшчэ азотнага ўгнаення — 20-30 г на метр квадратны мачавіны ці аміячнай салетры. Хоць і вядома, што гарох і сам вылучае азот у глебу, але гэта адбываецца толькі дзякуючы клубням, а яны фарміруюцца ў добра прагрэтай глебе, а ў красавіку глеба яшчэ халодная.

Каб насенне хутчэй узышло, прагрэйце яго на працягу 7 хвілін у гарачай вадзе (35-40 градусаў), растваруйшы ў ёй мікраўгнаенні. А можна апрацаваць насенне рэгулятарам росту. Ці патрымаць у злёгку вільготным асяроддзі, пакуль не праклюнецца. Але тады прарошчанае насенне высейвайце толькі ў вільготную зямлю. Можна сеяць і сухім насеннем гароху. У гэтым выпадку добра палівайце зямлю да пасадкі і на працягу некалькіх дзён.

А сеяць гарох можна ўжо ў канцы сакавіка. Спачатку сеюць раннія гатункі, праз тыдзень — сярэдняспелыя, яшчэ праз тыдзень — познія. Дзякуючы гэтаму гарох можна збіраць значна даўжэй. Калі ж гатункаў рознага тэрміну паспявання няма, то проста высейвайце гарох не ўвесь адразу, а ўсё адно з інтэрвалам у тыдзень-два, і будзеце мець свежы гарошак цэлы месяц і больш.

Насенне кладуць на глыбіню 3—4 см, на лёгкіх глебах — на 5—6 см. Пасля пасеву глебу злёгку ўшчыльняюць. Можна пасевы накрыць плёнкай ці спанбондам, хоць усходы гароху пераносяць паніжэнне тэмпературы да 6 градусаў.

Гарох добра рэагуе на ўшчыльнення пасевы. Таму паміж радкамі можна пакінуць 40—45 см, каб пасеяць туды салату, шпінат ці радыску. Дарэчы, калі гароху трэба зусім трохі, ён выдатна будзе пачувацца ў прыствольных кругах маладых пладовых дрэў. Там пакуль яшчэ досыць святла. А калі потым расліны закапаць у глебу, дрэвы атрымаюць самае лепшае ўгнаенне як узнагароду за прадастаўленае месца. Можна пасеяць трохі нізкарослага гароху ў радках бульбы, прыкрыць дзялянку плёнкай і атрымаць самы ранні ўраджай і таго, і другога.

Павялічыць ураджайнасць гароху можна прэпаратамі нітрагін ці рызатарфін, якія спрыяюць актыўнаму ўтварэнню клубняў, што ўзмацняе паглынанне азоту з паветра. Прэпараты ўносяць у глебу разам з насеннем ці апрацоўваюць яго перад пасевам. Прычым у цэні: яркае святло знішчае бактэрыі.

# АБРАЗАЕМ ЧАРЭШНЮ

**Абрэзка чарэшні падобная на абразанне іншых костачкавых, але нюансаў і тонкасцяў, вядома ж, хапае. Падобная як санітарная, падчас якой выдаляюцца ўсе хворыя, паламаныя галінкі і тыя, што растуць у сярэдзіну кроны.**

Цяпер пра асаблівасці. Ад пладовых дрэў мы перш за ўсё хочам ураджаю. Значыць, трэба дамагацца ўсімі магчымымі сродкамі, у тым ліку і абразаннем, штогадовай і масавай закладкі дрэвам кветкавых пупышак. А яны ў чарэшні ўтвараюцца на аднагадовых падоўжаных галінах і на букетных галінках.

Пры пасадцы ўвесну саджанцы-аднагодкі абразаюцца на вышыні 80—100 см. Калі вышыня саджанца меншая, то яго не кароцяць, але на наступны год парастак-працяг пакарочваюць пры вышыні больш за 80—100 см. З-за выразнай яруснасці галінавання знізу дапускаюцца 3-4 шкілетныя галіны. Калі асноўныя чарэшневыя галіны не падкарочваліся, то зона плоданашэння перамяшчаецца ў вонкавую частку кроны, паступова знізу агаляючыся.

Важны момант: пры ўкарочванні гадавога прыросту ў маладых чарэшань, незалежна ад тэрміну абразання, у гатункаў з вялікай парасткаўтваральнай здольнасцю неабходна выдаліць («асляпіць», скалупнуць) пасля зрэзу «на вонкавую пупышку» дзве ніжнія пупышкі, бо парасткі, якія развіліся з іх, пойдуць у рост пад вострым вуглом, і іх давядзецца выдаляць пры наступным абразанні. Парастак жа, які развіўся з трэцяй, ніжэйшай пупышкі, будзе больш гарызантальным, а значыць, хутчэй закладзе кветкавыя пупышкі і дасць ураджай.

Пры вышыні кроны 4-5 метраў можна выдаліць цэнтральны праваднік перакладам на бакавую моцную галіну. Гадавыя прыросты, меншыя за 70—90 см, не кароцяць. Пры даўжыні прыросту 20—25 см час рабіць амаладжальнае абразанне (т.зв. чаканку галін) на 2—3-гадовую драўніну. Пры гэтым абавязкова падкормлівайце і палівайце дрэва.

Лепшы час для зніжэння кроны чарэшні — час збору ўраджаю, калі ідуць моцныя роставыя працэсы. Менавіта гэта дазволіць дрэву хутка і бязбольна зарасціць зрэзы.

А яшчэ ўлетку вельмі карысна аказваецца прышчыпваць пункты росту парасткаў пры іх даўжыні не меней за 15—20 см (з другой дэкады мая і да чэрвеня). І абразаць малады прырост даўжынёй больш 40 см з другой дэкады чэрвеня да канца месяца. У гэтым выпадку 1/3 парасткаў выдаляюць секатарам на вонкавую пупышку. Да жніўня будзем мець 2—3 маладыя парасткі, якія развіліся з верхніх пупышак абрэзанага прыросту бягучага года.

# ПАРТУЛАК АГАРОДНЫ

**Партулак агародны — вядомая ўжо не адно тысячагоддзе расліна сямейства партулакавых, да якога адносяцца таксама дэкаратыўныя і пустазельныя віды партулаку. Гэта аднагадовая, агароднінная, травяністая расліна са сцяблом вышынёй 10-40 см.**

У натуральных умовах расце ў Крыме, на Каўказе, у Сярэдняй і Малой Азіі, Іране, Манголіі, Кітаі ўздоўж берагоў рэк, на палях, сенажацях і ў вільготных пясчаных месцах. У харчовых мэтах гэтую расліну выкарыстоўвалі яшчэ ў Старажытным Егіпце. Сёння партулак агародны культывуюць у краінах Міжземнамор'я, Закаўказзя і Сярэдняй Азіі. У ежу ўжываюць сакавітае тоўстае лісце і маладыя парасткі. Яны маюць лёгкі пякуча-кіслява-даўкі смак і асвяжальны водар. Лісце кругляваавальнае, мясістае (асабліва ў маладых раслін). Кветкі невялікія, жоўтыя, сабраныя па 2-3 шт. у верхняй частцы парасткаў. Аднак, нягледзячы на лёгкасць вырошчвання, у нас гэтая гародніна сустракаецца даволі рэдка.

Партулак агародны — суперпрадуктыўны і вельмі хуткаспелы: адна расліна дае ў год да 3 млн насення, якія захоўваюць усходжасць каля 40 гадоў! Насенне чорнае, матавае, круглявае (у 1 г — каля 2000 шт.), спее нераўнамерна і лёгка абсыпаецца.

### ВЫРОШЧВАННЕ

Партулак абсалютна непераборлівы. Расліна любіць асветленыя ўчасткі, якія добра прагравающа сонцам, з умерана ўрадлівай глебай. Да саставу глебы партулак не патрабавальны. Любіць вільготныя ўчасткі, але пры залішнім увільгатненні сцёблы могуць пашкоджвацца гніллю. Расліны партулаку цеплалюбівыя і гінуць пры невялікіх замаразках. Таму яго можна вырошчваць у адкрытым грунце ў безмарозны перыяд, а ў абароненым — практычна круглы год.

Яго дробнае чорнае насенне звычайна высейваюць на глыбіню 0,5—1 см ранняй вясной (красавік-май), але можна і на пачатку лета, шыракарадным спосабам (паміж радамі — 45 см), на добра асветленым участку. Усходы з'яўляюцца праз 3—5 дзён пасля пасеву. Калі насенне не засыпаць зямлёй, то ўсходы будуць больш дружнымі. Пасадкі неабходна добра паліць вадой і падтрымліваць глебу вільготнай да з'яўлення ўсходаў. Пасля з'яўлення маладых раслін іх прарэджванні, пакідаючы паміж імі адлегласць 8—10 см. Лішнія асобнікі можна перасадзіць на новае месца — партулак выдатна пераносіць перасадку. Ужо праз 16—20 дзён яны дасягаюць у вышыню 8—12 см. Першы ўраджай збіраюць ужо праз 3 тыдні пасля з'яўлення ўсходаў, наступныя — па меры адрастання новых парасткаў і лісця. Прычым, чым часцей яго зразаюць, тым больш ён разрастаецца. У перыяд вегетацыі партулаку патрабуюцца прарэджванні, праполкі, умераны паліў, рыхленне глебы (ці яе мульчыраванне драўняным пілавіннем). Для падаўжэння перыяду збору свежай зеляніны партулак можна высейваць у некалькі тэрмінаў. Прыбіраюць расліны, зразаючы іх і пакідаючы карані ў глебе. Уборку працягваюць па меры неабходнасці, пакуль расліна не пачне цвісці — а гэта адбываецца праз 28—35 дзён пасля з'яўлення масавых усходаў. Кветкі раскрываюцца толькі ў сонечнае надвор'е.

### КАРЫСНЫЯ ЎЛАСЦІВАСЦІ

Партулак валодае слабым пахам і даўкім, асвяжальным смакам. Яго можна есць у свежым, адварным, засоленым, кансерваваным выглядзе.



Арыгінальны ў салатах (з аліўкавым алеем), добра спалучаецца з супамі і іншымі стравамі з гародніны і мяса, выдатны дадатак у соусы і пікантныя маянэзы. Акрамя таго, сцёблы партулаку марынуюць. У зялёнай масе партулаку змяшчаецца цэлы комплекс карысных рэчываў: тлушчы, бялкі, вугляводы, арганічныя кіслоты, вітаміны C, E, F, P, PP, каратыноіды, алкалоіды, макра- і мікраэлементы (жалеза, кальцый, калій, натрый, магній, марганец, цынк, медзь, нікель і інш.). Апроч высокіх дыетычных якасцяў, агародны партулак валодае яшчэ і гаючымі ўласцівасцямі, што выкарыстоўвалі яшчэ старажытныя лекары. Ён спрыяе агульнаму ачышчэнню арганізма, нармалізуе працу сардэчна-судзістай сістэмы, страўнікава-кішачнага тракту, печані і нырак, змяншае ўзровень цукру і халестэрыну ў крыві, валодае жарапаніжальнымі, мачагоннымі, антысептычнымі і ранazaжыўляльнымі ўласцівасцямі, дапамагае пры бяссонніцы, імпатэнцыі і авітамінозах. Лісце і сцёблы партулаку выкарыстоўваюць пры лячэнні вочных хвароб і як глістагонны сродак.

Маючы такую расліну на сваім участку, вы не толькі разнастаіце сваё меню, але і застрахуеце сябе ад шматлікіх захворванняў.

■ Добрая навіна

# ХВОРЫМ СТАНЕ ЛЯГЧЭЙ

**У Магілёўскай гарадской бальніцы адкрыецца аддзяленне экстраннай медыцынскай дапамогі.**

У гэтай медыцынскай установе, якой больш за 200 гадоў, пачалася актыўная рэканструкцыя. Цяпер работы вядуцца ў старым хірургічным корпусе, да якога будзе зроблена прыбудова ў 4 паверхі. Там, у прыватнасці, размесціцца аддзяленне экстраннай медыцынскай дапамогі. Падобныя аддзяленні цяпер ствараюцца ва ўсім свеце, і яго магілёўскі варыянт можа стаць першым у нашай краіне.

Новае аддзяленне — зусім не значыць толькі новыя сцены, але і сучаснае абсталяванне.

— У новым будынку будзе размешчаны камп'ютарны тамограф, які набываe для нас Міністэрства аховы здароўя, — паведаміў галоўны ўрач гарадской бальніцы Міхаіл Максіменка. — Ён каштуе каля 35 мільярдаў рублёў і будзе працаваць у нас круглыя суткі дзеля дапамогі пацыентам.

Таксама ў новым аддзяленні будуць спецыяльныя функцыянальныя ложкі, аддзеленыя шырмамі, і да іх будуць падведзены сеткі для работы дыягнастычнага абсталявання на месцы. Для пацыентаў у цяжкім стане на суседнім паверсе будзе размешчана рэанімацыя.

Міхаіл Максіменка паведаміў, што аддзяленне экстраннай медыцынскай дапамогі, паводле плана, павінна запрацаваць ужо сёлетняй восенню. Паралельна ў бальніцы ідзе рамонт радзільні, дзе, дарэчы, у выніку з'явіцца і асобная радзільная зала, дзе жанчыны змогуць нараджаць дзяцей у прысутнасці сваякоў і з падтрымкай сваіх мужоў.

Ілона ІВАНОВА

Анталогія беларускага верша пра каханне

*Песняй вясны лебядзінаю...*

*Вядучы Алесь Каско*

# ЦІ МЁД, ЦІ АТРУТА, АЛЕ — ДА ДНА

Нястрымная жарсць, падобная да стыхіі прыроды, і ўтойванне сардэчнай пакуты за «празмерна салодкай усмешкай»; нясцерпнасць уласнай адзіноты і пачуццё віны перад тым, хто раптам стаў нямілы; боязь не атрымаць узаемнасці на прызнанне і першая блізкасць, калі «нага шукала доўга туфлік, бы сяродбагны астравок». Гэта толькі некаторыя нюансы інтымнай лірыкі Раісы Баравіковай, чые шматлікія зборнікі без такіх вершаў цяжка і ўявіць. Менавіта за кнігу «Каханне» ёй была прысуджана Літаратурная прэмія імя А. Куляшова, за «Люстэрка для самотнай» — Дзяржаўная прэмія Я. Купалы.

У зменлівай настроямі і перажываннямі (імя жанчыне, як вядома, непастаянства) яе паэзіі чытач нязменна знаходзіць блізкае яго душы. Многіх прывабіць і гэтыя два творы: першы — тонкай перадачай жалю ад імгненнай страты, другі — роздумам над сутнасцю кахання, якое не толькі мёд...

**Раіса БАРАВІКОВА**

○ ○ ○

*Зачэпіцца сонца*
*за снежную горку,*
*І хлыне ў даліну патокам вада...*
*Забуду апошнюю нашу гаворку,*
*А ўсё-такі...*
*нечага трошкі шкада.*

*Ніколі не выспее яблык дачасна,*
*за радасцю*
*часта прыходзіць нуда...*
*Сказаць не магу,*
*каб была я няшчасная,*
*ды ўсё-такі...*
*нечага трошкі шкада.*

*Бывае, заўважу*
*ў аконным праёме,*
*пытаюцца,*
*хто ты — такая бяда! —*
*спакойна адказваю —*
*проста знаёмы,*
*і ўсё-такі...*
*нечага трошкі шкада.*

○ ○ ○

*Чаму? Навошта? —*
*што ні дзень з пытання.*
*Вышукваеш нуды маёй*
*прычыны,*
*а я заўсёды думала, мужчыны*
*ніколі не ўдаюцца*
*ў сэнс кахання.*

*Як часам незаўважна*
*ўскрыліць мара,*
*надзея ўспыхне*
*з аднае усмешкі,*
*хто знае, на якіх*
